Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЖНІЎНЯ 2012 г. АЎТОРАК № 165 (27280) Кошт 1300 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

Мы разам — Беларусь!

Кобрын і Кобрынскі раён: людзі, справы, здабыткі. СТАР 3-6

Аўтаматызаваная сістэма аплаты ўжо ўкаранёна на дзвюх паркоўках Мінска. Сёлета будзе пабудавана 20 ахоўных стаянак. Шэсць аб'ектаў ужо здадзены, яшчэ тры будуць уведзены ў верасні, астатнія — да канца года. СТАР 7

Незвычайныя збудаванні з'явіліся на адным з астравоў Лепельскага возера — там арганізавалі пераходы для мурашак. У месцах міграцыі мурашыных калоній усталявалі тры драўляныя масткі... СТАР 8

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАПАНУЕ НАДАЦЬ ФЕСТЫВАЛЮ «КЛІЧ ПАЛЕССЯ» СТАТУС МІЖНАРОДНАГА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на адкрыцці Другога рэспубліканскага фестывалю «Кліч Палесся» прапанаваў надаць гэтаму мерапрыемству статус міжнароднага, паведамляе БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

«Я звяртаюся ў першую чаргу да дэлегацый Расіі, Украіны і Польшчы. Давайце зробім гэты фестываль міжнародным. Бог любіць тройцу, з трэцяга фестывалю і пачнём», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі праводзіцца шмат маштабных фестываляў, аднак менавіта «Кліч Палесся» вылучаецца асаблівай душэўнасцю, ідзе каранямі ў мінулае. «Таму фестывалю быць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У гэтым годзе фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» сабраў каля тысячы артыстаў з Беларусі, Расіі і Украіны.

АНДРЭЙ КАБЯКОЎ НАЗНАЧАНЫ КІРАЎНІКОМ АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка назначыў Андрэя Кабякова кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кабякоў Андрэй Уладзіміравіч нарадзіўся ў 1960 годзе ў Маскве. У 1983 годзе скончыў Маскоўскі авіяцыйны інстытут, у 1991 годзе — Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава, у 1991 годзе — Інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання КПБ. Працоўную дзейнасць пачаў майстрам механазборачнага цэха на заводзе імя С.І. Вавілава ў Мінску. У 1985—1988 гг. працаваў на заводзе «Дыяпраектар» у Рагачове, у 1988—1989 гг. — інструктар Рагачоўскага гаркама КПБ. У 1991—1995 гг. працаваў начальнікам планава-эканамічнага аддзела, намеснікам дырэктара па эканоміцы — начальнікам планава-эканамічнага аддзела завода «Дыяпраектар».

У 1995—1996 гг. быў намеснікам начальніка Службы кантролю Прэзідэнта Беларусі, 1996—1998 гг. — намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю, з чэрвеня 1998 года — прэзідэнтам Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці.

У 1998—2000 гг. — старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю, з 2000 года — першы намеснік прэм'ер-міністра, з 2001 года — намеснік прэм'ер-міністра, у 2002—2003 гг. — намеснік прэм'ер-міністра — міністр эканомікі, у 2003—2010 гг. — намеснік прэм'ер-міністра, у 2010—2011 гг. — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З лістапада 2011 года быў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі, пастаянным прадстаўніком Беларусі пры Еўразійскім эканамічным супольніцтве па сумяшчальніцтве.

ПРЭЗІДЭНТ ПРЫВЁЎ ДА ПРЫСЯГІ СУДДЗЮ ВЯРХОЎНАГА СУДА АЛЕГА ЛАТЫШЭВІЧА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка прывёў да прысягі суддзю Вярхоўнага суда Алега Латышэвіча, які раней быў назначаны на гэту пасаду прэзідэнцкім указам. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Алег Латышэвіч будзе займацца судовымі справамі ў сферы інтэлектуальнай уласнасці.

ЛЯСКАВІЦКІ фестываль «Кліч Палесся» адспяваў свае мілагучныя песні, весела і рухава адтанчыў, адгаманіў непаўторным палескім шматгалоссем. Тры дні таму сталіца Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» нагадвала сапраўдную ўзрушаную борць — бясконцыя і стракатыя чароды ўдзельнікаў і гасцей фестывалю ўздоўж набярэжнай, жыватворныя гукі гармонікаў і рытмічныя выстукванні бубнаў і абцасаў па падмостках, усмешкі на загарэлых тварах, большасць з якіх — сапраўдныя паляшуцкія тыпажы. А ўжо строяў якое было зіхаценне!.. Без іх, як ні намагайся, немагчыма ўявіць аблічча ўсёй нашай Беларусі. А тым больш Палесся. СТАР 2

ПОКЛІЧ НАД ПРЫПЯЦЦЮ

■ Сустрэча без абцасаў

Жанна БІРЫЧ:

«Я ДАГЭТУЛЬ ПРЫНОШУ ДАДОМУ КАШТАНЫ»

ЖАННА Бірыч — першая жанчына віцэ-мэр у гісторыі горада Мінска. Яна падзялілася з чытачамі «Звязды» крыніцай жыццёвай энергіі і натхнення, а таксама сакрэтам бездакорнага выгляду.

Пра чэмпіянат свету, бясплатны праезд і электронных кандуктараў

— Жанна Эдуардаўна, вы родам з Плешчаніц. Як даўно сталі мінчанкай?

— 10 гадоў таму. Тады я прыйшла працаваць у Мінаблвыканкам старшынёй камітэта эканомікі. Да гэтага 19 гадоў адпрацавала ў Лагойску. Прайшла ўсе пасады ад спецыяліста да намесніка старшыні райвыканкама па эканоміцы. Віцэ-мэрам Мінска з'яўляюся ўсяго толькі 8 месяцаў.

— Што за гэты час паспелі зрабіць для горада?

— Удалося пазбавіць валакіты работу з разглядам заяў інвестараў. Завочна заключана ўжо 66 дагавораў з замежнымі інвестарамі. І спыняцца на дасягнутым не збіраемся. Нядаўна разам з калегамі была на інвестыцыйным форуме ў Дубаі. Мы пастараліся дастойна прэзентаваць свой горад, паказаць яго інвестыцыйную прыцягальнасць.

— Якую задачу ставіце перад сабой на бліжэйшы год?

— Прыцягнуць у наступным годзе 950 млн долараў замежных інвестыцый. З гэтай мэтай плануем правесці ўласны інвестыцыйны форум, каб паказаць інвестарам усе магчымасці Мінска. Таксама трэба больш хуткімі тэмпамі развіваць гандаль, падцягваць гасцінічны і рэстаранны бізнэс, які ў нас пакуль на нізкім узроўні.

— Якая праблема сталіцы вас, як кіраўніка, хвалюе больш за ўсё?

— Актуальная праблема — развіццё малога бізнэсу. З усіх зарэгістраваных прыватных прадпрыемстваў толькі 7-8% — гэта вытворчы бізнэс. Трэба развіваць яго: дапамагаць ільготнымі крэдытамі, прэферэнцыямі па арэндным плаце. За малымі мабільнымі прадпрыемствамі, якія выкарыстоўваюць інавацыі, я бачу будучыню мегаполіса. Непакоіць і тое, што разумныя і ініцыятыўныя людзі, якіх у Беларусі дастаткова шмат, выязджаюць за мяжу. Міграцыйныя працэсы крыху спыніліся ў Мінску, але, тым не менш... Трэба ствараць умовы для ўкаранення інавацыйных ідэй на тэрыторыі горада.

— Вы курыруеце грамадскі транспарт, а самі на чым дабіраецеся на працу?

— На службовай машыне. Але па выхадных стараюся карыстацца грамадскім транспартам. Паколькі курырую яго, павінна бачыць усе магчымыя недахопы вачыма пасажыра. А наогул люблю хадзіць пешшу.

— Не за гарамі новы навучальны год. Студэнтаў цікавіць, ці змогуць яны ездзіць на грамадскім транспарце, як было дагэтуль, бясплатна.

— Пакуль не будзем уводзіць бясплатны праезд для студэнтаў. Ільгота застанецца толькі для школьнікаў. Бо сёння ў нашай краіне і так самы танны праезд у грамадскім транспарце: пасажыры плацяць толькі 30% ад яго кошту. СТАР 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ЦАЛКО, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:

«Забеспячэнне ўстойлівага тэрытарыяльнага развіцця, захаванне біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці, мінімізацыя ўздзеяння на клімат і адаптацыя да яго змяненняў зможа забяспечыць экалагічную бяспеку краіны, а таксама ўнесці свой уклад у глабальнае выжыванне і развіццё ўсяго чалавецтва. Нельга дазволіць сабе цяпер быць толькі пасіўнымі наглядальнікамі. Прыйшоў час дзейнічаць, дзейнічаць адкрыта і энергічна, каб наша Зямля заўсёды заставалася такой прыгожай, заўсёды гэтак жа шчодра дзялілася з намі сваімі дабротамі».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 19°
Віцебск	+ 17°
Гомель	+ 15°
Гродна	+ 18°
Магілёў	+ 16°
Мінск	+ 16°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 28.08.2012 г.

Долар ЗША	8350,00	▲
Еўра	10440,00	▼
Рас. руб.	262,00	■
Укр. грыўня	1030,67	▲

КАРАТКА

Цэны на айчынныя лякарствы будуць стабільныя, адзначыла начальнік аддзела фармацэўтычнай інспекцыі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Ала Даўгалікава. Паколькі лякарствы — сацыяльна значныя тавары, цэны на іх рэгулююцца дзяржавай. Апошнім часам выпадкаў неабгрунтаванага павышэння цэн выяўлена не было.

У планы ўрада Беларусі 2013 года ўваходзіць, каб інвестыцыі ў асноўны капітал па краіне склалі не менш як $20 млрд, з іх прамыя замежныя інвестыцыі — $4,5 млрд.

Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» працуе над сцэнарыем працягу вядомай беларускай кінастужкі «Белыя росы», паведаміў генеральны дырэктар кінастудыі Алег Сільвановіч. Працяг «Белых рос» плануецца зняць у жанры лірычнай камедыі, як была знятая арыгінальная кінастужка.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УРАГАН ПЕРАНЁС З'ЕЗД

Трапічны ўраган «Ісак» стаў галоўным ньюсмейкерам з'езда Рэспубліканскай партыі ЗША, які адкрыўся ў Тампе, штат Фларыда. З-за ўчарашняй непагадзі на з'ездзе не было прамоў рэспубліканскіх губернатараў паўднёвых штатаў, якія непасрэдна закрануў ураган. Па гэтай прычыне зацвярджэнне Міта Ромні афіцыйным кандыдатам у прэзідэнты ад Рэспубліканскай партыі перанесена на вечар аўторка. Амерыканскім рэспубліканцам давялося ўнесці сур'ёзныя карэктывы ў праграму доўгачаканага нацыянальнага з'езда. Нягледзячы на тое, што трапічны шторм стане ўраганам толькі другой катэгорыі (сумна вядомы ўраган «Катрына» заслужыў у 2005 годзе вышэйшую, пятую, катэгорыю), усе афіцыйныя цырымоніі перанесены на аўторак, а зорка з'езда — былы губернатар Масачусетса Міт Ромні, якога аднапартыйцы павінны будуць афіцыйна зацвердзіць у статусе кандыдата ў прэзідэнты, — прыедзе ў Фларыду толькі ў чацвер. У панядзелак дэлегаты з'езда сабраліся толькі ненадоўга, каб фармальна адкрыць партыйны форум.

«Ісак» змазвае старанна выбудаваную карцінку рэспубліканскага з'езда, якая павінна была забяспечыць Ромні новыя іміджавыя ачкі.

ЛЕНІНА Ў МАЎЗАЛЕІ ЗЮГАНАЎ ПРЫРАЎНЯЎ ДА МОШЧАЎ СВЯТЫХ У КІЕВА-ПЯЧЭРСКАЙ ЛАЎРЫ

Лідар КПРФ Генадзь Зюганаў у чарговы раз заявіў, што камуністы не дапусцяць перапахавання Уладзіміра Леніна, выказаўшы пры гэтым меркаванне, што знаходжанне апошняга ў маўзалеі адпавядае хрысціянству. Зюганаў сцвярджае, што «такая форма пахавання Леніна адпавядае праваслаўным канонам і традыцыям». «Супакойцеся і не тузайцеся. Вы збіраецеся арганізаваць чарговую Чачню на Краснай плошчы», — прыводзіць «Інтэрфакс» словы кіраўніка КПРФ, якія прагучалі ў панядзелак. Пры гэтым Зюганаў звярнуў увагу на тое, што форма пахавання Леніна не з'яўляецца адзінкавым выпадкам. У прыватнасці, ён спаслаўся на Кіева-Пячэрскую лаўру, дзе памерлыя не пахаваны ў зямлю. У лаўры можна нават убачыць мошчы Ільі Мурамца. Кіраўнік расійскіх камуністаў таксама адзначыў, што нельга перапахаваць і тых, чые астанкі знаходзяцца каля Крамлёўскай сцяны. «Перапахаванне магчыма толькі са згоды сваякоў, але ніхто з іх не выказаўся за перапахаванне з Краснай плошчы», — растлумачыў Генадзь Зюганаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

АМЕРЫКАНСКАЯ КАМПАНІЯ ГАТОВА Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ГАДЫ ПАБУДАВАЦЬ КАСМІЧНЫ ЛІФТ

Ідэя стварэння касмічнага ліфта — безракетнага спосабу дастаўкі грузаў на каляземную арбіту з дапамогай спецыяльнага троса — не дае спакою вучоным ужо некалькі дзесяцігоддзяў. Прыватная амерыканская кампанія LiftPort Group аб'явіла аб гатоўнасці пабудаваць эксперыментальны касмічны ліфт на паверхні Месяца пры дапамозе ўжо існуючых тэхналогій. Прэзідэнт кампаніі Майкл Лэйн сцвярджае, што на стварэнне такога ліфта патрэбна восем гадоў і спатрэбіцца ўсяго адзін запуск касмічнага апарата, параўнальнага ў тэхнічных адносінах з легендарным савецкім «Спадарожнікам-1».

У LiftPort Group упэўненыя ў поспеху і разлічваюць прыцягнуць патэнцыйных інвестараў пасля завяршэння палявых выпрабаванняў, якія плануецца правесці на сродкі, сабраныя ў інтэрнэце. На амбіцыйны праект ужо звярнула ўвагу НАСА. Сама ідэя касмічнага ліфта зусім не новая. Яна, у прыватнасці, апісана ў рамане 1978 года «Фантаны раю» Артура Кларка. Сучасныя канцэпцыі касмічнага ліфта мяркуюць наяўнасць звышмоцнага і лёгкага троса, адзін з канцоў якога замацаваны каля зямной паверхні, а другі знаходзіцца ў космасе. У нацягнутым становішчы ён утрымліваецца з дапамогай усталяванай на другім канцы процівагі за кошт цэнтрабежнай сілы кручэння планеты. Па тросе ад Зямлі да арбіты можа рухацца спецыяльны пад'ёмнік — свайго роду ліфт, які зможа дастаўляць на арбіту розныя грузы і нават людзей.

ЯК ВЫ ЛІЧЫЦЕ, ШТО БОЛЬШ ЦЯЖКА: ПАСТУПІЦЬ У ВНУ ЦІ Ў ЁЙ ВУЧЫЦЦА?

Уладзімір МАНУЛІК, прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт:

— У медыцынскі ўніверсітэт паступіць заўсёды было складана, але паступленне — гэта выключна тэхнічны момант, асабліва з улікам цяперашняй формы здачы ўступных іспытаў у выглядзе ЦТ, калі абітурыенты могуць проста расставіць адказы наўздагад. А навучацца ў нашай ВНУ, не сакрэт, надзвычай складана: вучоба вымагае шмат сіл, таму і база для яе павінна быць адпаведная. Калі першакурснікі ўпершыню сутыкаюцца з асаблівасцямі навучальнага працэсу, калі ўпершыню сутыкаюцца са смерцю чалавека, калі да іх прыходзіць разуменне, што самае каштоўнае ў жыцці — гэта здароўе і наша задача — дапамагаць людзям яго зберагчы... Ёсць студэнты, якія расчароўваюцца ў абранай прафесіі ўжо пасля першага курса, а ёсць і такія, да якіх усведамленне здзейсненай памылкі прыходзіць толькі бліжэй да заканчэння вучобы. Але ўсё ж такі абсалютную большасць нашых студэнтаў не пужаюць ні цяжкасці, звязаныя з навучаннем, ні магчымыя праблемныя моманты, звязаныя з будучай работай. Медыцынская адукацыя — вельмі грунтоўная, і, я б сказаў, нават фундаментальная. Яна адкрывае ў жыцці самыя шырокія магчымасці. Можа, таму яна ніколі і не страчвала сваю прэстыжнасць сярод маладых людзей.

Павел МАНДРЫК, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт:

— Лічу, што зараз паступленне ў ВНУ не з'яўляецца вялікай праблемай. Куды больш складана паступіць туды, куды хочацца, а менавіта на «бюджэт». А вось навучанне, асабліва на малодшых курсах, патрабуе ад студэнтаў вельмі добрай падрыхтоўкі па шэрагу дысцыплін, арганізаванасці і нават самааддачы. Фактычна першыя два гады мы вучым нашых студэнтаў вучыцца, бо ўсяму навучыць усё роўна немагчыма. Але для многіх гэта праблема, бо ў школе педагогі вядуць сваіх выхаванцаў за сабой, кантралююць іх, падказваюць ім, у якім кірунку далей рухацца, але не вучаць школьнікаў самастойна шукаць і распазнаваць веды. Хачу падкрэсліць, што атрыманне вышэйшай адукацыі — гэта не проста паход па дыплом, а самаадданая праца.

Іван ЯКІМЕНКА, настаўнік матэматыкі і інфарматыкі Лошніцкай гімназіі Барысаўскага раёна, суперфіналіст рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў «Настаўнік года-2011»:

— Безумоўна, цяжэй навучацца, і не ва ўсіх хапае сіл, цярплівасці і мэтанакіраванасці, каб прайсці ўвесь шлях дайсці да канца. Сярод маіх аднакурснікаў таксама да атрымання дыплома дайшлі не ўсе... Хоць, шчыра кажучы, у мяне праблем з паступленнем увогуле не было: калі я падаваў дакументы ў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут (цяперашні Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт), на руках у мяне быў «чырвоны» дыплом пасля заканчэння педагагічнага вучылішча. Таму я нават і не магу прыгадаць, якія ў той час былі конкурсы. Але адно магу сказаць дакладна: стаўленне да педагагічных спецыяльнасцяў з боку моладзі было зусім іншым. І мне крыўдна назіраць за тым, што адбываецца ў апошнія гады.

З іншага боку, у сярэдзіне 1990-х гадоў вышэйшая адукацыя яшчэ не лічылася гарантам матэрыяльнага і сацыяльнага дабрабыту, часы былі няпростыя, таму некаторыя з маіх аднакурснікаў кідалі вучобу, каб рэалізаваць сябе іншым чынам. Задачы — атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі любой цаной — перад маімі равеснікамі не стаяла.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У БЕЛАРУСІ МОЖА БЫЦЬ СТВОРАНЫ ІНСТЫТУТ ПАГАДНЕННЯ СА СЛЕДСТВАМ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 27 жніўня прыняў з рабочым дакладам старшыню Следчага камітэта Валерыя Вакульчыка. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы найперш цікавіўся праблемнымі момантамі, якія выявіліся ў працэсе фарміравання і работы Следчага камітэта: «Мяне больш хвалюе тое, што мы не зрабілі, або тое, што ў нас дрэнна пры фарміраванні Следчага камітэта, і што трэба будзе зрабіць. Важна, каб мы не пагоршылі сітуацыю з раскрыццём крымінальных злачынстваў».

Паводле слоў Валерыя Вакульчыка, час, які мінуў з моманту стварэння новага ведамства, даў магчымасць убачыць праблемы, а таксама рэальныя рэзервы, якія ёсць у дзейнасці Следчага камітэта.

Кіраўніку дзяржавы таксама даложана аб рабоце Следчага камітэта па пытаннях удасканалення дасудовага вядзення па крымінальных справах. У прыватнасці, прапрацоўваецца магчымасць стварэння інстытута пагаднення са следствам. У гэтай сферы быў вывучаны міжнародны вопыт, у тым ліку такіх краін, як Расія, Украіна, ЗША, і зроблены вывад аб неабходнасці больш дакладна рэгламентаваць у нацыянальным заканадаўстве правы і абавязкі бакоў. Канкрэтны механізм пакуль знаходзіцца ў стадыі прапрацоўкі, але яго сутнасць заключаецца ў магчымасці зніжэння тэрміну пакарання за ўчыненае злачынства пры супрацоўніцтве са следствам. Гэта мера, на думку старшыні Следчага камітэта, дасць магчымасць, з аднаго боку, улічыць інтарэсы грамадзян, а з іншага — аптымізаваць работу следчага, разгрузіць пракуратуру і суды. Аляксандр Лукашэнка даручыў прапрацаваць гэту прапанову сумесна з зацікаўленымі ведамствамі.

Акрамя таго, Валерый Вакульчык далажыў Прэзідэнту аб ходзе следства па некаторых крымінальных справах, якія атрымалі вялікі грамадскі рэзананс.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТУ ВЕНЕСУЭЛЫ Ў СУВЯЗІ З ГІБЕЛЛЮ ЛЮДЗЕЙ ПРЫ ВЫБУХУ НА НПЗ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавесу, а таксама родным і блізкім загінулых у выніку выбуху на буйнейшым нафтаперапрацоўчым заводзе краіны на паўвостраве Парагуана, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

ЖАДАЮЧЫХ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ДЭБАТАХ СЯРОД КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ПАКУЛЬ НЯШМАТ

Жадаючых удзельнічаць у дэбатах сярод кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання пакуль няшмат, паведаміў сакратар Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік.

Сакратар ЦВК прывёў у прыклад Гомельскую вобласць, дзе нават у абласным цэнтры ў большасці акруг або зусім няма жадаючых дэбатаваць, або толькі адзін кандыдат у дэпутаты заявіў аб сваім намеры прыняць удзел у дэбатах. У сельскіх выбарчых акругах удзельнікаў дэбатаў, хутчэй за ўсё, будзе яшчэ менш, лічыць Мікалай Лазавік.

Ён дадаў, што спачатку кандыдаты ў дэпутаты выступяць у тэле- і радыёэфіры з перадвыбарнымі праграмамі, дэбаты ж пачнуцца пазней. Як расказаў намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Марат Маркаў, канчатковы графік тэледэбатаў пакуль не гатовы. Колькасць кандыдатаў у дэпутаты, а значыць і магчымых удзельнікаў дэбатаў можа змяніцца — з улікам пададзеных у ЦВК скаргаў на адмову ў рэгістрацыі. Марат Маркаў звярнуў увагу, што на сайце Белтэлерадыёкампаніі ў прысвечаным выбарам раздзеле прэтэндэнты на дэпутацкае крэсла могуць знайсці спецыяльнае палажэнне, у якім агавораны тэрміны і ўмовы правядзення, парадак удзелу, рэгламент і іншыя пытанні арганізацыі і правядзення дэбатаў.

У сваю чаргу галоўны дырэктар Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Антон Васюкевіч удакладніў, што на бягучым рабочым тыдні трэба будзе актыўна папрацаваць з выступленнямі кандыдатаў у дэпутаты. «Далей будзе больш свабодна, ёсць акругі, дзе кандыдатаў няшмат, таму будзе магчымасць правесці і запісаць дэбаты. Разлічваем, што на першым рабочым тыдні верасня пачнём», — сказаў Антон Васюкевіч.

Закранаючы арганізацыю перадвыбарных выступленняў, ён адзначыў, што паслядоўнасць прэзентацый кожнага кандыдата ў дэпутаты распісана літаральна памінутна. Зроблена гэта для таго, каб яны маглі паведаміць сваім выбаршчыкам аб дакладным часе выступлення. Згодна з палажэннем ЦВК аб парадку выкарыстання СМІ пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, кандыдаты ў дэпутаты маюць права на адно бясплатнае выступленне па дзяржаўным ТБ і адно — па дзяржаўным радыё.

Кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў агучаць свае перадвыбарныя праграмы з 27 жніўня па 14 верасня.

Цэнтрвыбаркам прадугледзеў, каб выступленні прыпадалі на прайм-тайм: па тэлебачанні — з 19.00 да 20.00, па радыё — з 18.00 да 19.00. Тэле- і радыёдэбаты будуць праходзіць у гэты ж час, эфір для іх таксама будзе прадастаўлены бясплатна.

Прэтэндэнты на дэпутацкія мандаты, якія вылучаюцца ў Мінску, змогуць агучыць сваю перадвыбарную праграму і паўдзельнічаць у дэбатах у эфіры тэлеканала «Беларусь 2» і на хвалях радыёстанцыі «Сталіца». Кандыдаты, зарэгістраваныя па абласцях, акрамя Мінскай, выступяць па мясцовым тэле- і радыёвяшчанні. Асобам, якія балатуюцца ад Мінскай вобласці, эфірны час прадаставяць «СТБ» і «Сталіца». Кожнай тэлерадыёкампаніі, якой трэба будзе арганізоўваць дэбаты, ЦВК прапанаваў зарэзерваваць эфірны час з разліку пяць хвілін на кожнага кандыдата і пяць хвілін вядучаму. Калі з перадвыбарнымі праграмамі павінны выступаць толькі самі кандыдаты ў дэпутаты, то ў дэбатах таксама могуць удзельнічаць іх давераныя асобы.

На месца ў ніжняй палаце парламента прэтэндуюць 363 кандыдаты. З дня рэгістрацыі і па 22 верасня ўключна яны могуць весці ў спецыяльна адведзеных для гэтага месцах перадвыбарную агітацыю.

Датэрміновае галасаванне ў Беларусі пройдзе з 18 па 22 верасня ўключна. Асноўны дзень галасавання на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў назначаны на 23 верасня 2012 года.

Тым часам некаторыя кандыдаты ў дэпутаты злоўжываюць правам на перадвыбарную агітацыю, заявіў Мікалай Лазавік, каментуючы выпадкі, калі праграмныя выступленні прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат змяшчалі заклікі да байкоту выбараў.

Запісваць перадвыбарныя выступленні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пачалі ў канцы мінулага тыдня. Тым не менш ад акруговых выбарчых камісій паступаюць ужо звароты ў сувязі з тым, што некаторыя кандыдаты падмяняюць перадвыбарную агітацыю агітацыяй па зусім іншых матывах.

«Знаходзяцца грамадзяне, якія хочуць за дзяржаўны кошт агітаваць за антыдзяржаўнае мерапрыемства, за зрыў выбарчай кампаніі. Гэта супярэчыць выбарчаму заканадаўству, што прадугледжвае перадвыбарную агітацыю, якая павінна быць накіравана на заахвочванне выбаршчыкаў да ўдзелу ў выбарах, у галасаванні, а не наадварот», — падкрэсліў сакратар ЦВК.

Ён спаслаўся на артыкул 155 Выбарчага кодэкса, які дакладна дае азначэнне, што такое перадвыбарная агітацыя. Гэта дзейнасць грамадзян Рэспублікі Беларусь, палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, кандыдатаў, іх давераных асоб, маючая на мэце заахвоціць або заахвочвае выбаршчыкаў да ўдзелу ў выбарах, галасаванні за тых ці іншых кандыдатаў або супраць іх.

«Калі дзесьці хтосьці агітуе за байкот, гэта, можа быць, не з'яўляецца парушэннем грамадзянскага, адміністрацыйнага, крымінальнага заканадаўства. Да самога кандыдата ў дэпутаты ніякіх санкцый прымяняцца не будзе, але яго выступленне ў эфір не пойдзе», — растлумачыў Мікалай Лазавік. Як праінфармаваў сакратар ЦВК, паступіўшыя ад акруговых камісій звароты разгледзіць сёння Наглядальны савет па кантролі за выкананнем парадку і правіл правядзення перадвыбарнай агітацыі ў СМІ. Гэты савет створаны рашэннем Цэнтральнай камісіі. У яго ўваходзяць першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч, прадстаўнікі вядучых тэлевізійных, радыёканалаў і друкаваных СМІ.

«Эксперты прааналізуюць матэрыялы, якія паступілі з акруговых камісій, старшыні якіх сумняваюцца ў тым, што выступленні кандыдатаў адпавядаюць патрабаванням выбарчага заканадаўства», — расказаў Мікалай Лазавік.

БЕЛТА.

«Я ДАГЭТУЛЬ ПРЫНОШУ ДАДОМУ КАШТАНЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У прыватнасці, у Кіеве за адну паездку ў метро трэба выкласці 2 200 беларускіх рублёў, у нас жа — толькі 1 500. Аплачваць праезд студэнтаў бюджэту проста не па сілах. Нам неабходна прыводзіць горад у належны стан да чэмпіянату свету па хакеі: укладаць грошы ў рамонт дарог, вуліц, дварою. Будаўніцтва інфраструктуры, якая неабходна для новых дамоў, таксама вымагае шмат сродкаў.

— У мінскім метро нядаўна з'явіліся ўказальнікі на англійскай мове. Якія яшчэ сюрпрызы рыхтуеце пасажырам горада?

— Да канца года плануем увесці электронную сістэму аплаты за праезд у метро. У наступным годзе — на наземным транспарце. Гэта сусветная практыка. На ўваходзе ў грамадскі транспарт будзе стаяць прыстасаванне. Каб аплаціць праезд, дастаткова будзе прыкласці да яго картку, накшталт банкаўскай. Гэта будзе не толькі зручна, але і выгадна: скароціцца колькасць кантралёраў, а з часам яны наогул будуць не патрэбны.

Пра архідэі, бездакорны выгляд і маму-кіраўніка

— А можаце назваць тры якасці, якія дапамаглі вам у кар'ерным росце?

— Стараннасць, працавітасць і слабалюбства. Усяго ў жыцці дабілася сваёй працай. Калі трэба нешта зрабіць, буду гэта рабіць якасна і скрупулёзна, пакуль не атрымаю жаданы вынік.

— Падчас тэлефоннай размовы, калі дамаўляліся на інтэрв'ю, вы абмовіліся, што кабінет — ваш другі дом.

— Так, я тут, калі можна так сказаць, жыву. Таму, як і ў сваёй кватэры, стараюся ў кабінеце ўтульнасць. Дзе б я ні працавала, у мяне шмат кветак, пераважна экзатычных: пальмы, фікусы, архідэі. Я люблю архідэі.

— За што іх любіце?

— За іх індывідуальнасць, рэдкую адрознасць ад усіх кветак. Архідэі — простыя кветкі і ў той жа час вытанчаныя. Па ўнутраным стане я сябе адчуваю архідэяй.

— Жанна Эдуардаўна, у вас так арыгінальна завязана хусцінка. Падзяліцеся сакрэтам бездакорнага выгляду пры такім напружаным працоўным графіку.

— Гэта закладзена з дзяцінства. Мая мама заўсёды была дагледжанай. Лічу, што жанчына, у тым ліку і жанчына-кіраўнік, нягледзячы ні на што, павінна заставацца жанчынай. Я сачу за сабой, сама сабе раблю прычоску, макіяж. Вялікае значэнне, як вы самі заўважылі, надаю дэталям. Выказванне, што па вопратцы сустракаюць, а па розуме праводзяць, — гэта не пустыя словы, а для жанчыны асабліва. Таму стараюся заўсёды выглядаць добра.

— Раскажыце пра бацькоў.

— Мама мая ўжо на пенсіі. Яна была ўвесь час кіраўніком. Працавала ў сферы гандлю, намеснікам начальніка аддзела працоўнага забеспячэння ў Плешчаніцах, дырэктарам санаторыя «Баравое» ўпраўлення справамі Прэзідэнта. Працавітасць мая ад мамы перадалася. Гэта яе рыса характару. Мама выхоўвалася ў шматдзетнай сям'і. Маміны сёстры ўсе працавітыя. Нягледзячы на тое, што маюць вышэйшую адукацыю, яны не цураюцца ніякай працы, могуць усё: і тынкаваць, і парнік пабудаваць.

— А тата?

— Тата мой працаваў на птушкафабрыцы. Яго ўжо даўно няма з намі. Гэта самая вялікая страта ў маім жыцці.

Пра «боршчаны» суп, страхі і ўзрост

— Што вас радуе апошнім часам?

— Апошнія тры гады радуюся, калі назіраю за развіццём унучкі. У мяне заўсёды ў кватэры парадак. Стараюся яго пастаянна падтрымліваць. Але калі прыходзіць унучка, дазваляю рабіць хаос. Радуюся выхадным, калі да мяне прыязджаюць мае дзеці, ладжу для іх святочны абед.

— Любіце гатаваць?

— Цяпер я, безумоўна, гатую менш. І, безумоўна, калі прыходзяць дзеці, то хочацца парадаваць іх нечым смачным. Так павінна быць у кожнай сям'і, бо сям'я — гэта тое, без чаго наогул у жыцці нельга. Мая сям'я — мая апора, мой надзейны тыл.

— Што лепш за ўсё атрымліваецца?

— Чырвоны боршч, ці «боршчаны» суп, як мая дачка яго называла ў дзяцінстве. Навучылася гатаваць боршч так, каб ён быў смачны. Самае галоўнае — не ленавацца, і ўсяму можна навучыцца. А вучуся я заўсёды. І лічу, што кожны чалавек павінен вучыцца да самага апошняга дня.

— Чаму вы хочаце навучыцца?

— Што тычыцца прафесійнага росту, то пачынаю свой дзень з таго, што праглядаю эканамічныя сайты. У эканоміцы неабходна ўвесь час удасканальваць сябе. Стараюся штодзень аналізаваць свае ўчынкі, тым самым вучуся не паўтараць свае ж памылкі. У дзяцінстве я танула, таму панічна баялася вады. Сёлета ездзіла ў Балгарыю, вучылася плаваць. Мае сябры навучылі мяне катацца на лыжах. Працую над сабой, каб пераадолець тыя страхі, якія ў мяне ёсць. Бо страх блакіруе. Не баюся прымаць рашэнні і несці за іх адказнасць. І лічу, што людзі, якія баяцца прымаць рашэнні, не павінны займаць кіруючыя пасады, бо могуць прынесці непапраўную шкоду.

— У вас такія актыўныя сябры?

— Так. Мы — людзі розных прафесій, пазнаёміліся на адпачынку. Цяпер у іх дачны сезон. А вось восенню адкрыем тэатральны.

— Ёсць любімы тэатр?

— Ходзім у моладзевы тэатр, у Рускі імя Горкага на малую сцэну. Збіраемся, як правіла, кампаніяй 12 чалавек. Сярод нас ёсць жанчына, якая, нягледзячы на сваё нялёгкае жыццё, засталася жыццелюбівай. Мы жартам называем яе сваім прафсаюзным лідарам: яна ўсіх збірае, набывае білеты. Часам хаджу з імі ў лазню. Я ўдзячна сваім сябрам за тое, што не даюць адчуць сябе адзінокай. Мне на днях споўнілася 52, але я не адчуваю сябе на гэты ўзрост.

— Што для вас як для жанчыны з'яўляецца непрымальным?

— Хлусня і здрада, як, пэўна, і для кожнага чалавека. Мне давялося гэта ў жыцці вынесці не аднойчы. Але я навучылася дараваць. Нельга насіць у сабе крыўду і злосць, жыць мінулым. Чалавек, які даруе, рухаецца наперад. Самае галоўнае — знаходзіць радасць у жыцці, радавацца таму, што ёсць. Я прачынаюся і настройваю сябе на пазітыў, нават ведаючы, што ў мяне будзе вельмі цяжкі дзень. За чорнай паласой заўсёды прыйдзе белая. Гэта праверана.

— Ваша настольная кніга — часам не па псіхалогіі?

Калі месца, то МОРА. «Штогод разам з сябрамі езджу на мора. Яно мяне натхняе, падсілкоўвае на доўгі час. Пасля адпачынку хочацца рухацца наперад, тварыць — як на працы, так і дома». Калі жывёла, то САБАКА. «З павагай стаўлюся да сабак, бо яны адданыя і верныя». Калі пара года, то КАНЕЦ ВЯСНЫ і ПАЧАТАК ВОСЕНІ. «Люблю канец мая, калі ўсё ажывае, зеляней. Таксама падабаецца восень. Не дажджлівая і шэрая, а залатая. Калі дачка была маленькая, збіралі з ёй каштаны для вырабаў. І цяпер, калі праходжу каля каштанаў, абавязкова назбіраю, па звычцы».

— Так *(усміхаецца)*. Гэта кніга Лууле Віілмы «Дарую сабе». Я цікаўлюся псіхалогіяй, вельмі шмат працую над сабой. Гэта мне дапамагае ва ўзаемаадносінах з людзьмі, у тым ліку і па працы. Лічу, што базавых ведаў, якія даюцца нам у інстытуце, недастаткова. Псіхалогіяй трэба займацца заўсёды.

— Ёсць дэвіз, якім вы кіруецеся па жыцці?

— Не засмучацца і не паддавацца паніцы.

— Каму хацелі б сказаць сёння дзякуй і за што?

— Сваёй маме, дачцэ, сябрам. І, безумоўна, калегам па працы. Я цаню людзей, якія працуюць са мной, стараюся не прыніжаць. Наадварот, спрабую раскрыць здольнасці кожнага падначаленага і задзейнічаць іх у поўным аб'ёме. І мне пакуль гэта ўдавалася.

— Адчуваеце сябе шчаслівай?

— У кожнага чалавека сваё паняцце жаночага шчасця. Ёсць жанчыны, для якіх быт — гэта ўсё. Я ж, нягледзячы на цяжкасці і вялізную адказнасць, цяпер ужо не ўяўляю сябе без сваёй працы.

Надзея ДРЫЛА.
Фота Надзеі БУЖАН і з сямейнага архіва.

ПОКЛІЧ НАД ПРЫПЯЦЦЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каб больш ведаць і лепш разумець сябе, сваю культуру і яе глыбінныя карані, і праводзіўся другі па ліку фестываль этнакультурных традыцый, які сабраў на набярэжнай аграгарадка Ляскавічы лепшыя і яскравейшыя ўзоры народнай культуры Гомельшчыны і Брэстчыны. У свае гасцінныя падвор'і запрашалі Ельскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Лельчыцкі, Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі і Хойніцкі раёны. Візітоўкай Брэсцкага Палесся сталі Лунінецкі, Пінскі і Столінскі раёны.

Дарэчы, пра борць. Бадай, толькі палескія рэгіёны могуць сёння з гонарам пахваліцца захаваным старажытнейшым промыслам — бортніцтвам. Нездарма, нібы тыя сцягі, на пачатку «вуліцы» падвор'яў на высозных дрэвах узвышаліся тры калоды — сведкі мінулага і пазамінулага стагоддзяў. І адзін з утульных куточкаў свята быў спецыяльна прысвечаны менавіта гэтай галіне беларускага пчалярства. Як ні дзіўна, бортніцтва нават не збіраецца саступаць сучаснаму пчалярству, і некаторыя бортнікі маюць у сваіх гаспадарках да паўсотні калод.

Наогул, сялянскіх промыслаў дзе-дзе, а на Палессі яшчэ багата. Гэта і ўменне гатаваць смачную традыцыйную ежу, і аздобіць хату ткацтвам і вышываннем, і змайстраваць неабходныя ў сялянскім побыце прылады працы, паляўніцтва і рыбалоўства — найпершых заняткаў колішніх палешукоў. А бондары, ганчары, кашаплёты, кавалі — які кірмаш без іх? У Ляскавічах дэманстраваў сваё ўмельства нават спецыяліст па вырабе... гарэлкі.

Вядома, які кірмаш альбо фестываль без песні? У краіне нямала калектываў, якім нададзены статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці і якія годна захоўваюць народнае песеннае багацце менавіта палескага рэгіёна. Яны таксама ўдзельнічалі ў свяце. Але па-сапраўднаму яскрава раскрыліся і іншыя, пакуль мала вядомыя захавальніцы колішніх абрадава-бытавых песень. Наўрад ці хто з гасцей і гаспадароў фестывалю заставаўся абыякавы, пачуўшы выступленні фальклорных гуртоў — «Журавінкі» з Іванавай Слабады Лельчыцкага раёна, «Спадчыны» з Нароўлі, дзіцячага ўзорнага аб'яднання «Згадка» з вёскі Мочуль Столінскага раёна і іншых пераемнікаў і носьбітаў палескага песеннага скарбу.

— Мы хочам не толькі выявіць, але і як мага шырэй заявіць пра нашу самабытнасць, нашу духоўную спадчыну, — сказаў адзін з арганізатараў фестывалю «Кліч Палесся», генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпан Бамбіза. Ён упэўнены, што шляхам правядзення фестываляў можна не толькі моцна падтрымаць рэгіянальную культуру, але і значна амаладзіць яе захавальнікаў і пераемнікаў.

А ў Ляскавічах тым часам адбылося яшчэ адно вялікае свята: тут адкрыты ўнікальны музей прыроды. Першы гэткага ўзроўню ў краіне — па дызайне, багацці музейнай экспазіцыі і магчымасці адчуць сябе не толькі часткаю прыроды, але ўдзельнікам багатай гісторыі і не менш багатай палескай культуры.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

АБЗАЦ

◢ За мінулую пятніцу і выхадныя на дарогах краіны ў ДТЗ загінулі 8 чалавек, 58 атрымалі раненні. За кіраванне транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення затрымана 575 кіроўцаў.

◢ **У Маладзечне зарэзалі касірку букмекерскай канторы. Здарэнне адбылося ў пятніцу, 24 жніўня. Злачынца прыйшоў у кантору каля бара «Блюз» за некалькі хвілін да закрыцця, прыкладна ў 22 гадзіны. Патрабаваў у касіра грошы. Калі ён нанёс 39-гадовай жанчыне ўдар нажом, яна паспела націснуць кнопку выкліку аховы. Злачынца збег з месца забойства з выручкай. Касір загінула на месцы здарэння. Смерць жанчыны наступіла ад вострай страты крыві пасля колата-рэзаных удараў у шыю. Затрыманы 24-гадовы мужчына, якога падазраюць у злачынстве. Ён мае судзімасць.**

◢ У выніку моцнага ветру (да 14 метраў за секунду) у Гомельскай вобласці пацярпелі дзевяць населеных пунктаў у Добрушскім і Гомельскім раёнах. У асноўным былі разбураны апорныя канструкцыі дахаў. Шыферам, што зваліўся з даху сельскагаспадарчай пабудовы, былі забіты два бычкі. Вецер парушыў працу больш як 30 кіламетраў лініі электраперадач у Добрушскім раёне, былі абясточаны восем населеных пунктаў. Ад дрэў, што ўпалі на трох кіламетрах дарогі, утварыліся завалы.

◢ **У нядзелю са свайго незашклёнага балкона, размешчанага на 5 паверсе, па неасцярожнасці пры курэнні выпала 19-гадовая мінчанка, што пражывала па вул. Бяды. Ад атрыманых пры падзенні цялесных пашкоджанняў яна памерла на месцы.**

◢ Мастацкі кіраўнік ААТ «Dankoff Club» затрыманы ў Мінску. Яго падазраюць у стварэнні ўмоў для занятку прастытуцыяй, здзейсненае з выкарыстаннем службовых паўнамоцтваў. Праводзіцца расследаванне.

ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **У міжнародным аэрапорце Арланда ў Флорыдзе (ЗША) арыштавалі мужчыну, які спрабаваў нелегальна правезці 27 змей з ЗША ў Бразілію. Рэптылій, схаваных у стэрэасістэме, знайшлі супрацоўнікі аэрапорта падчас прасвечвання багажа. Матэус Дэль Марка набыў іх на выставе рэптылій. Агульны кошт змей склаў $10 тыс. Кантрабандыста прызналі вінаватым у вывазе нелегальнага грузу і аштрафавалі на $6 тыс. Акрамя таго, двое сутак ён правёў у турме. Па меркаванні спецыялістаў, Матэус збіраўся прадаць змей.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ДАЖДЖЫ АДПУСЦЯЦЬ, АЛЕ ПАХАЛАДАЕ...

У аўторак дажджлівы цыклон адыдзе далей у цэнтральныя раёны Расіі, а на тэрыторыю Беларусі пачнуць паступаць халаднаватыя паветраныя масы з боку Балтыйскага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава. Таму сёння месцамі, пераважна па ўсходзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўдзень не больш за 14—20 цяпла. У сераду атмасферны ціск працягне павялічвацца. Будзе пераважна без ападкаў, толькі на паўночным усходзе Віцебскай вобласці магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература ў ноч на сераду ўсяго 5—12, удзень — ад 16 цяпла па поўначы да 23 градусаў на поўдні краіны. А вось у чацвер і пятніцу пад уплывам зоны павышанага ціску будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай туман. Тэмпература ўначы 5—12, удзень у чацвер 18—25, у пятніцу — максімальна 20—26 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ТРАГЕДЫЯ НА ПАЛЯВАННІ

У Гомельскай вобласці паляўнічы выпадкова застрэліў свайго знаёмага, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Беларусі па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава. Трагедыя адбылася 25 жніўня каля 23.00 на кукурузным полі за 2,5 км ад вёскі Дзякавічы Жыткавіцкага раёна. 37-гадовы мужчына падчас незаконнага паляванння з незарэгістраванага ружжа 16-га калібру стрэліў у свайго знаёмага. Ад ранення ў грудзі 48-гадовы мужчына памёр да прыезду хуткай дапамогі. Паводле слоў страляўшага, яны прыйшлі на кукурузнае поле паляваць на кабаноў. Было цёмна. Мужчыны падзялілі поле на ўчасткі і дамовіліся страляць толькі ў свой бок. Калі ж хтосьці вырашыць перамясціцца, то павінен уключыць ліхтарык, каб другі яго бачыў. Паляўнічыя разышліся на зыходныя кропкі, і раптам каля аднаго з іх прабегла некалькі кабаноў. Мужчына стрэліць не паспеў, але пачуў шоргат і, як яму здалося, убачыў кабана сярод кукурузных пасеваў. Ён стрэліў, раздаўся стогн. Паляўнічы пабег на яго і ўбачыў свайго скрываўленага прыяцеля. Мужчына сам выклікаў «хуткую», але паранены памёр да прыезду медыкаў.

БЕЛТА.

■ Дзеля памяці

Якаў НАВУМЕНКА:

«БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ!..»

Ён больш ніколі не спяе гэтай песні. Папулярны беларускі артыст памёр у Севастопалі

ЖЫЦЦЁ спевака перарваў жудасны выпадак, якому няма тлумачэння. Лета, адпачынак каля мора, шпацыр, які павінен быў стаць прыемным. Але бываюць на вуліцы непрыемныя выпадковыя сустрэчы — як бываюць людзі, якія не разумеюць, што робяць: хуліганскі напад, заварушка... І ў выніку — чалавек у коме. Яшчэ была надзея на тое, што артыст, пасля намаганняў урачоў, апрытомнее. Але ён памёр у рэанімацыі адной з бальніц Севастопаля. Яму было ўсяго 53 гады.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным, блізкім і калегам народнага артыста Беларусі Якава Навуменкі ў сувязі з яго смерцю. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

«Усё жыццё Якава Навуменкі было цалкам прысвечана служэнню нацыянальнай культуры. Яго па праве называлі беларускім салаўём і залатым голасам сучаснай эстрады. Надзелены велізарным талентам, бліскучым выканальніцкім майстэрствам і няўтольнай творчай энергіяй, гэты выдатны артыст нязменна захапляў нас сваім мастацтвам, дорачы радасць тысячам прыхільнікаў» , — гаворыцца ў спачуванні. «Я перакананы, што часцінка яго душы, увасобленая ў песнях, назаўжды застанецца на беларускай зямлі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Светлая памяць аб выдатным артысце і сапраўдным чалавеку Якаве Паўлавічу Навуменку ніколі не згасне ў сэрцах беларусаў.

Народным ён быў і па сутнасці: колькі б ні было канцэртаў Якава Паўлавіча, заўсёды праходзілі з аншлагам. Умеў ён запаліць беларускімі песнямі, шмат якія сам здолеў зрабіць папулярнымі. І ўласна заўсёды даказваў, што беларускія песні будуць жыць, пакуль ёсць на свеце беларускія людзі. Ён заслужыў званне народнага артыста Беларусі — летась радаваліся ўсе прыхільнікі Якава Навуменкі, які прасоўваў не столькі самога сябе, колькі творы-песні. І па ім заўсёды было бачна, што спяваць іх для яго — вялікая радасць і нават задавальненне. Ці то з гуртом «Бяседа», дзе доўгі час Якаў Навуменка быў салістам, ці з ансамблем «Свята», ці з Дзяржаўным канцэртным аркестрам, дзе таксама выпала працаваць, ці з аркестрам імя Жыновіча...

Аршанец па нараджэнні, ён адчуваў смак беларускай мовы. Народнай песняй Якаў Навуменка асабліва захапіўся ў Мінскім музычным вучылішчы. Потым была перамога на конкурсе тады яшчэ Усесаюзнага радыё «Новыя імёны», вучоба ў інстытуце імя Гнесіных. Беларускі слухач палюбіў Якава Навуменку за яркія выступленні на айчынных фестывалях — «Маладзечна» ды «Славянскі базар», дзе ў яго заўсёды было шмат прыхільнікаў.

Алесь БАДАК, літаратар, паэт:

— Мы пазнаёміліся на пачатку 1990-х гадоў. Тады Яша пачаў займацца сольнай творчай дзейнасцю. Мала таго, ён сам стаў пісаць музыку да песень. Я быў з тых людзей, якія першымі пачалі з ім творчае супрацоўніцтва як з кампазітарам. Мы з ім напісалі не адну песню, якая потым набыла папулярнасць. Гэта песні для мяне ўсе любімыя, таму што яны вельмі светлыя — таму што светлым чалавекам быў сам Якаў Навуменка. Колькі мы з ім ні сустракаліся, дзе ні былі, я памятаю яго ўсмешку. Светлы вобраз становіцца перад вачыма, калі ўспамінаеш гэтага чалавека. Ён быў вельмі шчыры, вельмі добры. Безумоўна, у гэтую страту не верыцца, таму што ён яшчэ вельмі шмат хацеў зрабіць. У яго ў інтэрнэце ёсць старонка, дзе ён пачаў выкладваць беларускія песні — вельмі рэдкія і адметныя. Імкнуўся папулярызаваць беларускую песню. Ён у свой час арганізаваў конкурс песні пра Беларусь на беларускім тэлебачанні. Ён жыў музыкай, жыў беларускай песняй. Мне страшна гаварыць пра ўсё гэта ў мінулым часе...

Развітанне з народным артыстам Беларусі Якавам Навуменкам адбудзецца ў сераду ў Белдзяржфілармоніі.

Шчыра смуткуем і спачуваем сям'і артыста.

Ларыса ЦІМОШЫК і ўсе звяздоўцы

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі з заўчасная трагічнай смерцю народнага артыста Беларусі, артыста-вакаліста (саліста), вядучага майстра сцэны Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя Іосіфа Жыновіча ўстановы «Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія» НАВУМЕНКІ Якава Паўлавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Кобрынскі раён

Помнік у гонар перамогі над войскамі Напалеона — сімвал Кобрына.

Старшыня Кобрынскага райвыканкама Мікалай КЕНДА:

«У НАШЫМ ГОРАДЗЕ ЁСЦЬ УСЁ, КАБ ДОБРА ПРАЦАВАЦЬ І АДПАЧЫВАЦЬ»

У 2012 годзе на Кобрыншчыне адбылося шмат падзей, якія засталіся ў памяці жыхароў гэтага паўднёвага раёна Беларусі. Аб тым, з якімі вынікамі ўжо спрацавала Кобрыншчына і якія планы на будучыню, — размова са старшынёй Кобрынскага райвыканкама Мікалаем Кендам.

— Вядома, мы не самы магутны рэгіён у Брэсцкай вобласці, але ж у першую пяцёрку па аб'ёмах прамысловай прадукцыі выходзім. Аб'ём прамысловай вытворчасці за 7 месяцаў 2012 года ўзрос на 224,4 % у дзеючых цэнах да ўзроўню адпаведнага перыяду 2011 года і склаў 1 трыльён 134 мільярды 644 мільёны рублёў. Кобрынскі раён становіцца ўсё больш прывабным для спонсараў, адкрываюцца новыя вытворчасці, ствараюцца дадатковыя працоўныя месцы. На Кобрыншчыне працуе 58 прадпрыемстваў з капіталам Расіі, Германіі, Нідэрландаў, Італіі, Кітая, Эстоніі, ЗША, Украіны і іншых краін. У нас ёсць усе перадумовы для прыцягнення ў эканоміку раёна замежных інвестыцый. Эканоміка добра працуе і цяпер, а значыць, ёсць магчымасць для ажыццяўлення новых сацыяльных праектаў.

— Якія прадпрыемствы робяць найбольшыя ўкладанні ў агульныя вынікі?

— Упэўнена лідзіруе сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ПП Палессе», дзе зараз працуе 1587 супрацоўнікаў. У апошнія гады яно стала горадаўтваральным. Удзельная вага прамысловай прадукцыі гэтага прадпрыемства ў аб'ёме раёна складае 24,5 %. Добрымі тэмпамі развіцця адзначаюцца ААТ «Кобрынаграмаш», «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод», «Кобрынскі Хімік», філіял РУПП «Брэстхлебпрам» «Кобрынскі хлебазавод» і іншыя. За 7 месяцаў 2012 года ў рэгіёне пабудавана 34 720 квадратных метраў жылля пры гадавым заданні па ўводзе яго ў эксплуатацыю ў 40 000 квадратных метраў. У тым ліку ўзведзены 4 шматкватэрныя жылыя дамы. Індывідуальнымі забудоўшчыкамі ўведзена ў эксплуатацыю каля 140 жылых дамоў. Таксама выконваем запланаваныя паказчыкі па росце заработнай платы: сёння працаўнікі Кобрыншчыны зарабляюць у сярэднім 2 мільёны 612 тысяч рублёў.

— Як вы ацэньваеце працу аграрнай галіны?

— Сёлета земляробы раёна дасягнулі рэкорднага ўраджаю збожжа. Гаспадаркі па ўраджайнасці і валавым намалоце перавысілі ўзровень мінулага года. Да дажджоў паспелі сабраць асноўны ўраджай. Нашы аграрыі настойліва і паслядоўна ішлі да гэтай мэты, прадэманстравалі высокае майстэрства і волю. Ужо на пачатак жніўня гаспадаркі Кобрыншчыны перасягнулі па намалоце збожжа 100000-ю мяжу пры ўраджайнасці 35,2 цэнтнера з гектара. Гэта важкае ўкладанне ў багаты ўраджай Брэстчыны. У аграпрамысловым комплексе Кобрыншчыны стабільна працуе шэраг сельскіх гаспадарак, сярод якіх можна вызначыць СВК «Узыходзячая зара», «Раданежскі», ААТ «Гарадзец-агра», Агра-Кобрынскае», «Стрыгава», «Астромічы». Надзейная аснова працы на сяле — добрая тэхнічная абсталяванасць, валоданне сучаснымі тэхналогіямі вытворчасці, планамерная мадэрнізацыя фермаў. Да працягу актыўнага будаўніцтва на сяле нас стымулявала распараджэнне Прэзідэнта краіны па рэканструкцыі і рамонце малочнатаварных фермаў. Думаю, да 2015 года ў нас будзе добры рост і ў галіне мяса-малочнай вытворчасці. Інвестыцыі, якія сёння ўкладаюцца ў будаўніцтва на вёсцы, даюць права верыць, што і надалей сельская гаспадарка будзе актыўна развівацца.

— А што ўяўляе сёння недзяржаўны сектар эканомікі Кобрынскага раёна?

— У нас створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця бізнэсу. Бізнэс прадстаўлены практычна ва ўсіх сферах жыццядзейнасці раёна — ад сельскай гаспадаркі да галіны аховы здароўя. За 7 месяцаў 2012 года ў Кобрынскім раёне зарэгістраваны 284 новыя суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. З іх 238 індывідуальных прадпрымальнікаў і 46 камерцыйных арганізацый. У сферы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва за 7 месяцаў 2012 года створана 535 новых працоўных месцаў. 45 фермерскіх гаспадарак карыстаюцца 1641 гектарам сельгасугоддзяў раёна (1,6%). Фермеры ў большасці спецыялізуюцца на вырошчванні сельскагаспадарчых культур, некаторыя займаюцца рыбай, малаком і яловічынай.

— Мікалай Аляксеевіч, наколькі паспяховы рэгіён у сацыяльна-эканамічным развіцці?

— Вядома, «Дажынкі», якія прайшлі ў Кобрыне ў 2009 годзе, можна сказаць, далі гораду і яго жыхарам новы адлік часу. Горад літаральна змяніў сваё аблічча. У нас з'явіліся амфітэатр, аквапарк, Лядовы палац, прыгожая набярэжная, адноўлены Дом культуры і многае іншае. Аднак і сёння актыўна развіваецца сацыяльная сфера, прычым не толькі ў райцэнтры. За дастаткова кароткі тэрмін у раёне адбыліся вялікія перамены. 15 населеных пунктаў атрымалі статус аграгарадкоў. Мы і сёння будуем жыллё, пракладваем сеткі каналізацыі і водаправода. Прыняты прыклад: толькі за апошнія 2 гады прыродны газ падведзены ў аграгарадкі — Навасёлкі, Павіцце, вёскі Акцябр, Закросніца, Сялец працягласцю 12,3 кіламетра. У 2012 годзе вядзецца будаўніцтва газаправодаў да вёсак Грушава, Пескі-1, Мінянка, Яромічы, Яўсімавічы працягласцю 9,3 кіламетра. Перавозку пасажыраў на гарадскіх і прыгарадных маршрутах здзяйсняе транспарт не толькі нашага аўтапарка, але і маршрутныя таксі індывідуальных прадпрымальнікаў. Пастаянна ўдасканальваецца матэрыяльна-тэхнічная база гандлёвых прадпрыемстваў раёна. Сёлета адкрыта 17 новых крам і кавярняў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзіцячая пляцоўка ў гарадскім парку адпачынку.

аб гэтым падтапленнямі. Менавіта таму зараз у гэтых мікрараёнах пачаліся работы па стварэнні сучаснай ліўневай каналізацыі. Хутка ў Кобрыне з'явіцца супермаркет. У планах і далейшае паляпшэнне сацыяльнай сферы. Так, будзе пабудаваны дзіцячы садок на 240 месцаў. Набудзе новае аблічча стаматалагічная паліклініка. Ёсць вельмі цікавыя напрацоўкі для інвестыцый, і, калі ўсё спраўдзіцца, будзе папаўняцца наш бюджэт і, адпаведна, развівацца сацыяльная сфера.

— У Кобрыне з'явілася некалькі вельмі прывабных для турыстаў аб'ектаў...

— Напрацовак у гэтым кірунку шмат. Мы павінны прыцягнуць да сябе ўвагу не толькі замежных турыстаў, але і сваіх — тых, хто хоча проста адпачыць і ўмацаваць сваё здароўе. Для гэтага ў нас створаны аб'екты аграгурызму, ёсць лядовая арэна, аквапарк, парк імя Суворава. У гэтым спісе не вельмі шмат гасцініц, таму летась на трасе Брэст — Масква мы пачалі праектаванне будаўніцтва новага турыстычнага комплексу, які ўключае трохпавярховую гасцініцу, аўтастаянку, кавярню і розныя месцы для адпачынку. Кобрын сёння мае ўсё, каб можна было добра і працаваць, і адпачываць. Вельмі прыемна, што народ пачаў паважаць свой горад. Павысілася культура людзей, і яны зараз цэняць тое, што маюць вакол сябе. Гэта значыць, усё правільна робіцца для таго, каб жыхарам раёна было лепш жыць менавіта тут, у сябе дома.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ:

Мікалай Аляксеевіч Кенда нарадзіўся ў 1951 годзе ў вёсцы Вялікае Міжлессе Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Пачынаў сваю працоўную дзейнасць на пасадзе майстра ПМК-17 трэста «Пінсксаўгасбуд» (г. Бяроза).

Затым працаваў галоўным інжынерам і начальнікам перасоўнай механізаванай калоны ў горадзе Іванава. З 1986 па 1995 год кіраваў калгасам «Кастрычнік» (Іванаўскі раён). У 1995—1998 гг. — намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама. На працягу пяці гадоў узначальваў абласную «бытоўку». У 2002 годзе стаў старшынёй Камянецкага раённага выканаўчага камітэта, а з снежня 2005 года кіруе Кобрынскім раёнам.

Натуральную прыгажосць падкрэсліваем кветкамі

У зелянгасе мясцовага ЖКГ кветкі растуць круглы год. Расаду тут вырошчваюць для ўсяго горада, нават на продаж.

Майстар па ўтрыманні зялёных насаджэнняў Любоў Трубчык расказвае,

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Кветкаводы Алена РЫЖУК і Надзея ЖУК.

як штодня яны ўпрыгожваюць родны горад. Паводле слоў работніц, цяпер яны адчуваюць асаблівую адказнасць за знешні выгляд вуліц, сквераў. Пасля «Дажынак» 2009 года горад літаральна пераўтварыўся: 725-гадовы Кобрын памаладзеў і пахарашэў непазнавальна. І калі на будаўніцтва новых аб'ектаў, на рамонт і абнаўленне грошы выдзеліла дзяржава, то падтрымліваць усё гэта ў належным стане цяпер ужо справа гонару месцічоў. Вось і шчыруюць працаўніцы ўчастка жыллёва-камунальнай гаспадаркі над кожнай клумбай, малой архітэктурнай кампазіцыяй, якую часта ствараюць сваімі рукамі.

Пастаянна на ўчастку працуе 14 чалавек, летам па працоўным дагаворы найманць яшчэ прыкладна столькі ж. Вялікі ўчастак работы — скошванне травы ў парках, скверах, шматлікіх зялёных зонах. Платную паслугу па скошванні травы аказваюць і насельніцтву. Ёсць і свая крама па продажы кветак і іншых дэкаратыўных раслін.

На самім участку ў другой палове працоўнага дня мы засталі ўсяго трох работніц, якія рыхтавалі расаду. «Астатнія на гарадскіх аб'ектах, — расказала Любоў Сямёнаўна, — садзім кветкі, тыя, што адцвілі, мяняем на новыя. Стараемся натуральную прыгажосць прыроды падкрэсліваць кветкамі і іншымі зялёнымі насаджэннямі».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«ДАРУЮ ГОРАД КНЯГІНІ СВАЁЙ...»

Галоўную плошчу Кобрына ўпрыгожвае помнік князю Уладзіміру і княгіні Вользе. Гэта ён, князь Валынскі, сын Васількаў, унук Раманаў, 725 гадоў таму падараваў каханай жонцы горад. Падзея адлюстравана ў Іпацьеўскім летапісе і лічыцца першым пісьмовым успамінам пра Кобрын. І гэтая прыгожая гісторыя стала адным з культурных брэндаў горада. Яе абавязкова расказваюць экскурсаводы, ды і самі гараджане, гасцям Кобрына. А гасцей бывае нямала. Адзін толькі Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава за год наведвае каля 30 тысяч чалавек з добрага дзясятка краін.

Дырэктар музея Алена Бабенка заўважыла, што музей доўгія гады збірае і беражліва захоўвае ўсю гісторыю тутэйшага краю, а не толькі матэрыялы, звязаныя з жыццём палкаводца Суворава і ваеннымі падзеямі. Тут вам абавязкова раскажуць, як ва ўладанне ўступіла каралева польская і вялікая княгіня літоўская Бона Сфорца. Разумная італьянка заахвочвала развіццё рамесніцтва і земляробства. У 1540 годзе па тэрыторыі сучаснай Кобрыншчыны быў пракладзены канал каралевы Боны. Спецыялісты назвалі яго першым меліярацыйным аб'ектам на землі Беларусі. Напрыканцы XVI стагоддзя Кобрын зноў падарылі саноўнай даме — на гэты раз Ганне Ягелонцы. Апошняя паспрыяла атрыманню магдэбургскага права. Тады ж горад займеў і свой герб: на сярэбраным полі дзве жаночыя фігуры — Багародзіцы з немаўляткам Ісусам і святой Ганны. З той пары герб не раз мяняўся. Але ў 2004 годзе Кобрын зноў атрымаў гістарычны герб — праўда, пасля некаторай рэканструкцыі.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

ТРЫ ПЫТАННІ АД ПАКУПНІКА АБ КРАМЕ «ПЕРЕКРЁСТОК»

Фасад крамы «Перакрёсток».

Перакрыжаванне, ці, па-руску, «перекрёсток», у шматлікіх сусветных культурах заўжды было знакавым і сімвалічным месцам. Новы сэнс такая знакавасць набыла для жыхароў вуліцы Каралёва ў Кобрыне і ваколіц пасля акрыцця абноўленай крамы «Перакрёсток» ААТ «Гандлёвае прадпрыемства «Надзея».

Чым крама адметная?

Знаходзіцца яна ў раёне прыватнага сектара. У большасці вакол – звычайныя драўляныя дамы. Ехаць да бліжэйшай буйной гандлёвай кропкі — некалькі хвілін на машыне. Раней і «Перакрёсток» быў невялікай прадуктовай крамкай, але пасля абнаўлення атрымаў новае жыццё ў жніўні мінулага года:

— Раней наша «гаспадарка» была прыкладна ў такіх межах, — паказвае загадчык крамы Вольга Невар на плошчу, меншую за палову сённяшняй гандлёвай залы.

— Цяпер сюды з задавальненнем прыходзяць не толькі жыхары бліжэйшых вуліц, але і людзі з цэнтра горада, і з бліжэйшых вёсак.

Вялікая зручнасць — купіць усе прадукты адразу, маючы магчымасць выбраць як па кошце, так і па якасці.

— Прадукцыю атрымліваем як беларускую, так і імпартную. Прадстаўнікі разнастайных кампаній самі прыходзяць на заяўкі, — расказвае Вольга Мікалаеўна. — Напрыклад, кандытарскія вырабы — і расійскія, і ўкраінскія, і свае беларускія. Малочныя прадукты прадаём кобрынскія, а таксама бярозаўскія, пружанскія, брэсцкія, мінскія. Мы не абмяжоўваем сябе ў плане рэгіёна ці краіны. Тым не менш, 80 % прадукцыі — беларускай вытворчасці. Заўжды хочацца зрабіць асартымент як мага больш шырокім. Усе без выключэння пакупнікі хочуць, каб было з чаго выбраць.

Што са зніжкамі і бонусамі?

Калі казаць пра зніжкі, то тут «Перакрёсток» пайшоў насустрач сваім пакупнікам. Паколькі ў раёне, дзе размешчана крама, жыве вельмі шмат пажылых людзей, то для іх па панядзелках з 8 да 10 гадзін раніцы дзейнічае зніжка ў 5% на ўсе тавары.

Пастаянныя наведвальнікі крамы «Перакрёсток».

Яшчэ адна зручнасць для пакупнікоў гэтай катэгорыі — у будынку крамы ёсць аптэка.

Ёсць у краме і месца для тавараў па акцыях, як робіцца, напрыклад, у гіпермаркетах. Таму набыць па зніжцы тавар тут можна і такім чынам.

Да таго ж для пакупнікоў, што прыязджаюць на аўто, ёсць вялікая зручная стаянка.

Ці задаволіць мяне абслугоўванне?

Паколькі раён невялікі, многія пакупнікі і прадаўцы добра ведаюць адзін аднаго, таму за сваю працу калектыў «Перакрёстка» нясе дадатковую адказнасць.

— У нашым калектыве толькі два мужчыны, грузчыкі, — гаворыць Вольга Невар. — Астатнія — жанчыны і дзяўчаты. Думаю, з людзьмі нам пашанцавала. Зразумела, выбар быў вельмі сур'ёзны, будучыя супрацоўнікі праходзілі гутарку. Тыя, хто прыйшоў, у асноўным маладыя, сярэдні ўзрост —30-35 гадоў.

Многія пакупнікі ўжо даўно наладзілі трывалыя стасункі з крамай. Людзі прыходзяць і заказваюць тое, што хацелі б купіць. Напрыклад, нядаўна адна жанчына замовіла для сваіх дзяцей, што жывуць у Расіі, шакалад беларускай вытворчасці. Казала, што ў мінулы раз вельмі спадабаўся, таму ўзяла цэлую каробку. Торты, вэнджанае мяса, каўбасныя вырабы пэўнай вытворчасці звычайна замаўляюць напярэдадні святаў.

Пажылыя людзі часта сумяшчаюць паход у краму з магчымасцю пагаварыць «за жыццё».

— Дзяўчаты працуюць у нас маладыя, а з моладдзю нашым пакупнікам размаўляць надзвычай цікава, — тлумачыць загадчык крамы.

Сама Вольга Невар працуе ў гандлі з 1985 года. Была і прадаўцом, і намеснікам загадчыка крамы.

Яе цёзка, пастаянная пакупніца «Перакрёстка» спадарыня Вольга, якая, пераступіўшы парог, адразу ж павіталася з усімі прадаўцамі, падзялілася сваім меркаваннем пра краму:

— Тут мне падабаецца ўсё. Пасля рамонту стала так прыгожа і прасторна. Да таго ж загадчыца — цудоўны чалавек. Адказны і патрабавальны. Абавязкі свае выконвае з павагай як да пакупнікоў, так і да супрацоўнікаў. У «Перакрёсток» заўжды прыемна зайсці.

УНП 200094074

Загадчыца крамы Вольга НЕВАР (справа) і таваразнаўца Наталля КАЗЛОВІЧ складаюць заяўку на бакалейную прадукцыю.

Прадавец Ірына НЕВАР і грузчык Аляксандр КАЛАГРЫВАЎ каля вітрыны з садавінай і агародніна.

Полесье

Дзіўна, як нечакана часам збываюцца мары. Памятаю галоўную цікавасць дзяцінства: даведацца б, адкуль бяруцца шакаладкі, марозіва і цацкі. Ажыццявілася адна з частак гэтай мары нечакана, і ўжо ў зусім не дзіцячым узросце, візітам на сапраўдную цацачную фабрыку. Аказваецца, вытворцы дзіцячай радасці прапісаліся ў Кобрыне.

ВЫТВОРЦЫ ДЗІЦЯЧАЙ РАДАСЦІ

Усё пачыналася з аднаго станка

— У 1998 годзе, калі прадпрыемства было створана, мы не мелі такіх, як сёння, маштабаў. Усяго толькі адзін станок для выдзімання. За гэтым станком даводзілася працаваць і нашым цяперашнім кіраўнікам (дарэчы, дырэктар прадпрыемства Андрэй Гольцман сёлета атрымаў ад Брэсцкага аблвыканкама званне «Чалавек года»). Адной з першых цацак, якіх тады выпускалася ўсяго два-тры найменні, была пластмасавая пірамідка, — расказвае інжынер па ахове працы СТАА «ПП Палессе» Алег Сцепанішчаў, праводзячы нас па прасторным будынку цэху. Памяшканне вельмі светлае, з камфортнай тэмпературай, што адразу адчуваецца пасля гарачыні на вуліцы.

Сёння на прадпрыемстве 1,8 тысячы супрацоўнікаў, 850 з якіх падчас змены знаходзяцца ў вытворчым цэху. Выпускае «Палессе» больш за тысячу відаў прадукцыі, якая экспартуецца ў 27 краін свету. Падчас наведвання прадпрыемства хочацца ўсё разгледзець, да ўсяго дакрануцца нават дарослому. Рэакцыю дзяцей на прадукцыю можна толькі ўявіць. Пажарныя машыны, грузавікі, наборы для гульні ў доктара, механіка, прадаўца, наборы для маленькіх прыгажунь, вялікія грузавікі, на якіх можна сядзець, электрамабілі — толькі некаторыя цацкі, што выпускаюцца «Палессем». Акрамя таго, на прадпрыемстве вырабляюць і тавары спажывецкай групы — напрыклад, пластмасавыя вазоны для пасадкі кветак ці посуд.

У новы цэх пераехалі тры гады таму. Вытворчасць патрабуе адпаведных маштабаў, бо прадпрыемства поўнасцю ахоплівае працэс выпуску цацкі — ад нарыхтоўкі дэталяў да прадукцыі ва ўпакоўцы і дастаўкі яе ў месцы продажу. У планах — пабудаваць яшчэ адно памяшканне, дзе будзе аўтаматызаваная лінія па вытворчасці цацак.

Усе цацкі абавязкова праходзяць дзяржаўную медыцынскую рэгістрацыю. Ніводны ўзор прадукцыі не трапляе ў крамы без гэтай працэдуры.

Яшчэ ў пачатку сваёй дзейнасці «Палессе» заваявала свайго пакупніка менавіта якасцю. Цацкі кітайскай вытворчасці, можа, і таннейшыя, затое, набываючы кобрынскую прадукцыю, можна не хвалявацца за здароўе дзяцей. Дарэчы, для афарбоўкі пластмасы на прадпрыемстве выкарыстоўваюць харчовы фарбавальнік. Гэта робіцца, каб у маленькіх спажыўцоў не было алергіі. Дзеці ж часам любяць «спрабаваць» цацкі на зуб.

УНП 200652036

З клопатам пра маленькага спажыўца



Інжынер па тэхніцы бяспецы прадпрыемства Алег СЦЕПАНІШЧАЎ (справа) і начальнік вытворчага цэха Ігар ДАВІДЗЮК каля пульта кіравання вытворчай лініяй.

Усе цацкі вытворчасці СТАА «ПП Палессе» зроблены з пластмасы. У некаторых бацькоў гэты матэрыял выклікае недавер. Маўляў, розныя хімічныя рэчывы, якія месяцца ў пластмасе, могуць нашкодзіць дзіцяці.

Гэта сапраўды можа адбыцца, калі цацка няякасная. «Палессе» гарантуе сваім пакупнікам экалагічнасць і бяспеку:

— Цацка праходзіць тры этапы кантролю, — гаворыць Алег Сцепанішчаў. — Першы — падчас рэгістрацыі сыравіны і камплектуючых, другі — на адпаведнасць тэхналагічнай карце пры вырабе дэталяў у вытворчым цэху, і трэці — гэта праверка ўжо гатовай прадукцыі, выпушчанай у зборачным цэху.

Прадукцыя прадпрыемства «Палессе».

«У нас працуе цвет горада»

Гэта пра цудоўных жанчын, якіх на прадпрыемстве большасць. Менавіта іх рукамі збіраюцца і ўпакоўваюцца аб'екты дзіцячых мар. Мужчыны працуюць за станкамі, што вырабляюць дэталі для цацак, а таксама на пагрузцы, транспарціроўцы.

Новая лінія, якую плануецца запусціць, паўплывае на колькасць працоўных месцаў толькі станоўча: спатрэбіцца ўзяць на работу яшчэ 200-300 чалавек.

Супрацоўнікі карыстаюцца ўсімі сацыяльнымі гарантыямі, што прадугледжаны беларускім заканадаўствам. Да таго ж ёсць і невялікія бонусы. Напрыклад, у рэкламе цацак здымаюць дзетак супрацоўнікаў прадпрыемства. На рэкламных плакатах, якія развешаны ў тым ліку і ў цэху, — толькі родныя ўсмешкі. Працуюць на прадпрыемстве сямейныя пары, сваякі і нават цэлыя дынастыі, якіх цяпер каля ста. Калі ж даводзіцца прымаць на працу новага работніка, абавязкі яго яму падрабязна тлумачаць і стараюцца дапамагаць першым часам.

Ёсць у калектыву і час для агульнага адпачынку. На прадпрыемстве праводзяць сваю спартакіяду, дзе жаночыя і мужчынскія каманды спаборнічаюць у дартсе, перацягванні каната, бадмінтоне; ёсць таксама калектыў мастацкай самадзейнасці, дзе кожны работнік можа рэалізаваць свой талент і здольнасці.

Калі ж казаць пра агульную карціну вытворчасці, то тут варта адзначыць працу ўсяго калектыву, бо сёння кожны спецыяліст — бухгалтар ці вадзіцель, спецыяліст па ўліку ці будаўнік, слесар-інструментальшчык ці ліцейшчык пластмас (на прадпрыемстве больш за 120 прафесій і спецыяльнасцяў) — працуе для таго, каб разам з ростам яго ўласнага дабрабыту расло і развівалася прадпрыемства, мацнела і набывала сучасны еўрапейскі выгляд.

Зборачны цэх. Зборшчыцы Любоў ЛІТВІНЕНКА, Алена ШАРАМУК і Таццяна ЗАБІРАН.

Новыя фермы ААТ «Стрыгава» яшчэ і танныя

— Зараз мы займаемся рэканструкцыяй дзвюх жывёлагадоўчых фермаў. Дабудоўваем, паляпшаем умовы працы, механізіруем працэсы, — дырэктар ААТ «Стрыгава» Ігар Масько расказвае і паказвае аб'екты, якія выглядаюць, хутчэй, новымі, чым адноўленымі.

Рэканструкцыя малочнатаварнага блока, які адбудаваны за крэдытныя рэсурсы і сродкі сельгаспрадпрыемства, амаль закончана — застаецца толькі глянец навесці і ў верасні можна будзе ўрачыста адкрываць, плануе Ігар Валер'евіч:

Дырэктар ААТ «Стрыгава» Ігар Валер'евіч МАСЬКО

Нарадзіўся і вырас у роднай вёсцы Стрыгава. Пасля заканчэння школы пайшоў працаваць механізатарам. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут па спецыяльнасці «Аграномія». Прайшоў працоўны шлях ад брыгадзіра, агранома, начальніка ўчастка да дырэктара.

Танна і якасна

— Усё робіцца ў першую чаргу для павышэння якасці малака. Безумоўна, гэта павінна прынесці дадатковыя грошы нашай гаспадарцы. Але, што немалаважна, гэта і стварэнне дастойных умоў працы для людзей. Тут будзе нармальнае сучаснае ацяпленне, вентыляцыя, асвятленне. Зразумела ж, сёння нельга абысціся без халадзільнага абсталявання і лабараторыі. Усё будзе камп'ютарызавана. Дарэчы, тут ужо ўстаноўлена імпартная дальняя ўстаноўка «Вестфалія».

Невыпадкова толькі сёлета на базе менавіта гэтай гаспадаркі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці прайшлі тры абласныя семінары. Калегі цікавіліся, якім чынам аб'ект, які звычайна каштуе 12 млрд. рублёў, атрымалася пабудаваць толькі за 4 мільярды. Сакрэт адкрывае Ігар Масько:

— Гаспадарчым спосабам будуем. Не наймаем падрадчыкаў, а самі ўсё робім. Таму значна танней і атрымліваецца. У нас ёсць свае прараб і будаўнічая брыгада з 15 чалавек, якія працуюць круглы год. Але ж зараз дадаткова ў гаспадарцы працуюць яшчэ 32 наёмныя рабочыя. Па дагаворы людзям плоцім дастойны заробак, а самі купляем усе матэрыялы і забяспечваем неабходнай тэхнікай. У асноўным мясцовыя працуюць, але ж ёсць, што і са Століна, з Кобрына прыязджаюць. Некаторыя штодзень ездзяць на аўтобусе дадому (гэта ж толькі 15 км), а іншыя жывуць у інтэрнаце.

Загадчыца фермы Марыя ДЗЕНІСЮК і ветурач Аляксандр ДРУГАК гатовы да работы на адноўленай ферме

50 на 50

У ААТ «Стрыгава» за многа гадоў склалася шматгаліновая спецыялізацыя вытворчасці прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі, якая для гаспадаркі з'яўляецца найбольш эфектыўнай. Палова выручкі ідзе ад раслінаводства, палова — ад жывёлагадоўлі. Займаюцца вытворчацю і малака, і мяса. Адначасова саджаюць буракі, харчовае зерне і кармы.

Два гады таму да «Стрыгава» далучылі суседнюю гаспадарку — цяпер тут апрацоўваюць 5 300 га зямлі. На пяці малочнатаварных фермах утрымліваюць 4,5 тысячы галоў буйной рагатай жывёлы, з іх 1500 дойных кароў, а таксама — цяляты. Паўсотні бычкоў на адкорм, ды і для свіней месца знайшлося. Людзі ўсе добра працуюць, цяжка вызначыць самых лепшых, падкрэслівае дырэктар гаспадаркі Ігар Масько, аднак называе прозвішчы сваіх падначаленых, якія з'яўляюцца ўзорам для іншых:

— Гэта даяркі Таццяна Актысюк, Ніна Ляўчук, Кацярына Рута, Валянціна Марчук, цялятніцы Аксана Шлег, Вольга Марчук, Валянціна Падашвялёва, Тамара Шлег...

У планах — развіццё мясной галіны, у тым ліку вытворчасць «мармуровага» мяса, бо вельмі гэта выгадна. Праўда, пакуль сродкі накіроўваюцца на вырашэнне першачарговых задач. З улікам выкананых, іх дастаткова. Дарэчы, толькі за апошня два гады значна абнавілі машынна-трактарны парк гаспадаркі. Набылі 4 энерганасычаныя трактары, пагрузчык «Амкадор», два камбайны КЗК-1218, зернесушыльны комплекс ЗСК-30Г, кормаўборачны камбайн «Ягуар», даільную ўстаноўку і многае іншае. Вынікі не прымусілі чакаць. Сёлета прыбыткі ўжо значна вышэй, чым летась. Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі складае 24 %, а летась была толькі 6. Рэнтабельнасць продажу — 17 %. Сельгасвытворцы ААТ «Стрыгава» ў 3 разы ў параўнанні з мінулагоднімі паказчыкамі павысілі выручку, якая складае 15,3 мільярда рублёў.

Старшы камбайнер Леанід МЯДЗВЕДЗЕЎ і камбайнер Мікалай БРЫШТЭН

Сёлета з палёў ААТ «Стрыгава» сабрана 6800 тон збажыны. Намалоты гэтага года значна пераўзышлі мінулагоднія. Ураджайнасць зерневых склала 40 ц з гектара. Не першы год механізатары гаспадаркі вызначаюцца ў працоўным спаборніцтве на жніве. Вось і сёлета сярод перадавікоў дырэктар называе тых, на каго павінны раўняцца астатнія: гэта механізатары Леанід Мядзведзеў, Аляксандр Галаўніч, Аляксандр Валяваты, кіроўцы Мікалай Магдасюк, Сяргей Стоцкі, Сяргей Мядзведзеў...

Утульней, чым у горадзе

Пяць гадоў будзе ў снежні, як вёска Стрыгава набыла статус аграгарадка. Людзі высока ацанілі тыя ўмовы, якія ім стварылі пры дапамозе дзяржавы. У тым ліку праведзеную газіфікацыю, заасфальтаваныя дарогі, пабудаваныя дамы. Дарэчы, жыллё для супрацоўнікаў тут працягваюць будаваць. Сёлета 9 сем'яў атрымалі ключы ад новых дамоў. Сярод іх малады ветурач ААТ «Стрыгава» Аляксандр Другак.

Цэнтр населенага пункта, які, па афіцыйных сведках, быў заснаваны яшчэ ў пачатку XIV стагоддзя, зараз упрыгожваюць адноўленыя будынкі Стрыгаўскай сярэдняй школы, ФАПа, Дома культуры, аддзялення паштовай сувязі... За кошт асабістых сродкаў гаспадаркі ў аграгарадку была пабудавана царква, узведзены помнік землякам, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны... Дапамогу сацыяльнай сферы кіраўніцтва гаспадаркі лічыць адной са сваіх галоўных задач.

Сёння цэнтральная сядзіба мае сучанае аблічча — гэта добраўпарадкаваны населены пункт з усёй неабходнай інфраструктурай, якая адпавядае дзяржаўным сацыяльным стандартам. Можа, таму і моладзь даўно не імкнецца пакідаць родную вёску. Навошта, калі тут створаны ўсе ўмовы для нармальнага жыцця? 272 чалавекі працуюць зараз у ААТ «Стрыгава». І абсалютная большасць — мясцовыя жыхары. Толькі некалькі спецыялістаў прыязджаюць сюды з Кобрына на работу. Заробкі, гаворыць кіраўнік гаспадаркі Ігар Масько, людзі атрымліваюць розныя:

— Механізатары, даяркі, цялятніцы, будаўнікі атрымліваюць не менш за 3 мільёны, а то і больш. Умовы створаны, астатняе залежыць ад жадання кожнага чалавека працаваць. Цякучка кадраў у калектыве невялікая, можна сказаць, нулявая. Мы імкнёмся заахвочваць лепшых не толькі заробкамі і прэміямі, але, напрыклад, даём беспрацэнтныя пазыкі на суммы ад 15 да 30 мільёнаў. Такая магчымасць ўзаконена ў калектыўным дагаворы. Чалавек 70 імі ўжо скарысталася. Хто ж дапаможа нашым працаўнікам, калі не мы? Самае дарагое для нас — гэта чалавек.

Зернесушыльны комплекс ЗСК-30Г

Новая вуліца аграгарадка Стрыгава

«ДАРУЮ ГОРАД КНЯГІНІ СВАЁЙ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Многія войны пракаціліся праз тутэйшыя мясціны, шмат крыві пралілося на кобрынскую зямлю. Паўстанні і іх бязлітасныя падаўленні, рабаванні чужынцаў — усё перажываў горад. Ураджэнец Кобрынскага павета Тадэвуш Касцюшка ў сакавіку 1794 года быў абвешчаны кіраўніком узброеных сіл падчас паўстання за ўзнаўленне незалежнасці Рэчы Паспалітай. А ўжо ў верасні пад Дзівінам войскі Суворава разбілі перадавыя атрады паўстанцаў і занялі Кобрын. Яшчэ праз тры дні каля вёскі Крупчыцы расійская армія разграміла корпус генерала Серакоўскага. За гэтую перамогу «ў вечнае валоданне» фельдмаршалу Суораву ўказам Кацярыны II была перададзена сядзіба «Ключ Кобрынскі». Больш чым праз паўтара стагоддзя пасля той падзеі ў доме знакамітага палкаводца быў створаны ваенна-гістарычны музей.

Сёння тут захоўваецца ўнікальная экспазіцыя, аснову якой складаюць сапраўдныя прадметы XVIII стагоддзя. Ёсць узоры зброі, ваеннага абмундзіравання, прадметы побыту. У сярэдзіне мінулага стагоддзя нямала каштоўных экспанатаў прывезлі з Расіі. У тым ліку і аўстрыйскую артылерыйскую гармату. Гармата ўдзельнічала ў баі пад Кобрынам у чэрвені 1812 года. Тады Напалеон прайграў бітву. Гэта была першая перамога над аўстрыйскім корпусам Напалеона на тэрыторыі Расійскай імперыі. І гэтым летам у Кобрыне адзначалі 200-годдзе першай перамогі расійскіх войск ў Айчыннай вайне 1812 года. У Кобрыне многа гістарычных, памятных мясцін. Адных толькі будынкаў з шыльдай «Ахоўваецца дзяржавай» больш за сотню.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Наша справа — падтрымліваць прыгажосць

Працу Кобрынскай ЖКГ можна заўважыць адразу па прыездзе ў горад. Безліч кветак, чысціня, утульныя месцы для адпачынку, цікавыя кампазіцыі ў дварах і на гарадскіх клумбах.

А колькі аспектаў працы застаюцца нябачнымі для вока звычайнага чалавека! Да таго ж на балансе прадпрыемства знаходзіцца і адна з візітных картак Кобрына — аквапарк, які даўно аблюбавалі не толькі беларусы, але і замежныя госці. Нядаўняе свята горада, так бы мовіць, актывізавала ўсе кірункі дзейнасці. Кобынская ЖКГ сёлета на рэспубліканскім конкурсе заняла першае месца па тэхнічным утрыманні жылфонду.

— Наша справа — толькі падтрымліваць гэтую прыгажосць, што якраз і лічыцца самым складаным, — сціпла расказвае пра поспехі **дырэктар КУМВП ЖКГ «Кобрынская ЖКГ» Сяргей ЯЛЕЦ.** — Сёння ў штаце прадпрыемства каля 1000 работнікаў. Лічы, што ўсё жыццезабеспячэнне горада знаходзіцца на нашай адказнасці. Цяпло, саначыстка, рытуальныя паслугі, гасцініца, аўтатранспарт, «Зелянгас», дарожнікі, ахова, будаўнікі, аквапарк. Толькі «Водаканал» працуе асобна.

Як гавораць, лепш адзін раз пабачыць, чым сто разоў пачуць. Таму едзем у аквапарк, каб непасрэдна пазнаёміцца з адной са сфер дзейнасці Кобрынскай ЖКГ. Будынак з вялікімі вокнамі адразу прыцягвае ўвагу. Унутры — плёскат вады і дзіцячыя галасы. Пабавіць час у водных забавах — цудоўны варыянт для летняй спёкі.

— У нашай рабоце мы маем два кірункі — адпачынак і аздараўленне, — праводзіць экскурсію па аквапарку намеснік дырэктара па турызме і аздараўленні насельніцтва Кобрынскай ЖКГ Вадзім Кахноўскі.

У летні час аквапарк наведвае да 1,5 тысячы чалавек. Сярод кліентаў сёння вельмі шмат расіян. Адно асноўнае адрозненне ад іншых беларускіх аквапаркаў — статус. У Кобрыне не проста аквапарк, а аздараўленчы цэнтр, у якім, акрамя басейна і медыцынскіх працэдур, ёсць свая гасцініца з усімі выгодамі. Асноўная маса пуцёвак прадаецца яшчэ ў канцы лістапада — студзені.

Што датычыць харчавання, то ў Кобрынскім аквапарку стараюцца ствараць меню на самыя розныя густы, у тым ліку і дыетычныя, якія распрацоўваюцца з дапамогай дактароў-супрацоўнікаў аздараўленчага цэнтра.

Наведвальнікаў аквапарка, якія вырашаць паплёскацца ў басейне, не пакінуць абыякавымі чатыры горкі, з якіх можна з разгону з'язджаць у ваду, тры джакузі, надводныя і падводныя масажныя ўстаноўкі і шматлікія іншыя забавы. Можна смела браць з сабой і дзяцей да трох гадоў. У аквапарку для іх ёсць спецыяльны басейн.

Тым, хто захоча аздаравіцца, прапануюць шырокі спектр паслуг: гідрагальванічныя камерныя ванны, бескантактны гідрамасаж, галатэрапія, камерная спелеатэрапія, розныя віды душаў і ваннаў (кантрасныя, арамастычныя, жамчужныя, лекавыя), гразелячэнне сапрапелевай граззю. Нядаўна ў аздараўленчым цэнтры з'явіўся і свой SPA-кабінет.

Акрамя таго, у аквапарку праводзяць заняткі па аквааэробіцы, ёсць трэнажорная і гульнявая залы, а таксама зала, дзе можна наведаць рускую, турэцкую ці фінскую саўну.

Аквапарк супрацоўнічае з тураператарамі, таму адпачывальнікі могуць сумясціць аздараўленне ці адпачынак з пазнавальнымі экскурсіямі па бліжэйшых адметнасцях — напрыклад, па Белавежскай пушчы ці страусавай ферме.

Наколькі наведвальнікі задаволены ўзроўнем паслуг, можна меркаваць па шчаслівых вачах дзяцей, якія падчас нашага візіту заўзята каталіся на вадзяных горках. Прыгажосць удвайне прыемная, калі яна прыносіць плён і радасць іншым. А падтрымліваць гэтую прыгажосць у кабрынчан, як бачым, атрымліваецца.

УНП 200039915

ААТ «Гідрамаш»:

«ПА СУАДНОСІНАХ «КОШТ-ЯКАСЦЬ» МЫ Ў БЕЛАРУСІ ФАКТЫЧНА НЕ МАЕМ КАНКУРЭНТАЎ»

Наведванне гэтага прадпрыемства стала для нашых карэспандэнтаў самай загадкавай падзеяй за ўсю камандзіроўку. Не звязанаму са сферай машынабудавання чалавеку цяжка ўявіць, як выглядаюць гідрацыліндры і навошта іх выраблюць. Узоры прадукцыі, якія мы пабачылі ўжо ў фае завода, зноў жа распалілі яшчэ большую цікавасць і, адпаведна, — нарадзілі некаторую колькасць пытанняў, на якія згадзіўся адказаць дырэктар завода гідраўлічнага машынабудавання «Гідрамаш» Сяргей ВАЛАДЗЬКО.



— Сяргей Раманавіч, раскажыце, калі ласка, аб прадукцыі вашага прадпрыемства? Для чаго і для каго яна?

— Наша прадукцыя — гэта гідрацыліндры самага рознага прызначэння (для сельгасмашын, дарожнай тэхнікі). Дыяметр выраба ў — ад 25 да 180 мм. Акрамя гідрацыліндраў мы выпускаем і пнеўмацыліндры для аўтамабільнай тэхнікі, а яшчэ — седлавыя счэпныя прыстасаванні для цягачоў тыпу «МАЗ». Таксама ёсць маленькі від прадукцыі — пячное ліццё. Гэта адносіцца да тавараў народнага спажывання. Ліццё робіцца і на патрэбу завода. Па сутнасці, калі браць суадносіны «кошт-якасць», гідрацыліндры фактычна не маюць канкурэнтаў.

Прадукцыя на 80% ідзе на канвеерныя пастаўкі для нашых беларускіх машынабудаўнічых прадпрыемстваў. Супрацоўнічаем з МАЗам, МТЗ, Гомсельмашам, Бабруйскім заводам трактарных дэталяў і агрэгатаў. Астатні аб'ём прызначаны для экспарту. Карыстаюцца кобрынскімі гідрацыліндрамі ў Расіі, краінах Балтыі, Малдове, Судане, В'етнаме, Пакістане, Егіпце. Трэба сказаць, што экспарт прыносіць прадпрыемству найбольшы даход. Па выніках паўгоддзя аб'ём замежных паставак вырас на 135%.

— Наколькі сучаснае на заводзе абсталяванне?

— Абнаўляць стараемся па магчымасці. Вось нядаўна набылі некалькі сучасных выпрамляльнікаў току шведскай фірмы «Крафт». Увогуле, за апошнія тры гады прыкладзены максімальныя намаганні для тэхнічнага перабсталявання завода. За гэты час было набыта абсталяванне расійскай, чэшскай, тайваньскай вытворчасці. У 2010 годзе на сродкі інавацыйнага фонду для завода было куплена 10 станкоў беларускай вытворчасці.

— А сыравіна? Пастаўляеце з-за мяжы?

— Намагаемся пастаянна змяншаць колькасць прывазной. Цяпер, калі завод увайшоў у холдынг «Аўтакампаненты», ажыццяўляюцца цэнтралізаваныя закупкі.

— Хочацца даведацца пра гісторыю прадпрыемства.

— Заводу «Гідрамаш» сёлета споўнілася 72 гады. Заснаваны ён у 1940 годзе. На нашай тэрыторыі і сёння захаваліся некаторыя будынкі таго часу, і яны яшчэ эксплуатуюцца. Пачынаўся завод са звычайных рамонтных майстэрняў, рамантавалі аўтамабілі сямейства «ГАЗ». Штодзённа работнікі спраўляліся з 22 машынамі. Гэта быў першы завод у рэспубліцы па арганізацыі менавіта канвеернага рамонту аўтамабіляў. У часы «перабудовы» патрэба ў гэтай дзейнасці адпала, але якраз тады з'явілася задача асвоіць вытворчасць аўтакрана тыпу «Іванавец».

Слесар-зборшчык 4-га разраду з 30-гадовым стажам Сцяпан ТАРАСЮК на зборцы гідрацыліндраў.

Аператар станкоў з ЧПУ Аляксей ПРЫВЯДЗЕНЕЦ з гатовым вырабам.

Тады нашаму заводу даручылі займацца вытворчасцю гідрацыліндраў для гэтай машыны. Супрацоўнікам давялося вывучаць аналагічную працу па ўсім былым СССР. Апорны гідрацыліндр Ц22 — першы асвоены. З гэтага і пачалося развіццё вытворчасці. Сёння завод выпускае больш за 400 відаў цыліндраў.

— Для такой значнай колькасці, відавочна, патрэбен вялікі штат работнікаў?

— Зараз на «Гідрамашы» працуе прыкладна 820 чалавек. Шчыра кажучы, з кадрамі часам бывае цяжкавата, бо побач мяжа, і, зразумела, многіх прываблівае большы заробак, таму праца ў іншай краіне часта набывае перавагу над магчымасцю ўладкавацца на завод у родным горадзе. Цяпер крыху іншае стаўленне да жыцця — гэта можна зразумець.

Асабіста я маю ў працоўнай кніжцы адзін запіс. У 1978 годзе прыйшоў на гэты завод і пачаў працаваць токарам 2-га разраду. Так атрымалася, што прайшоў усе прыступкі кар'ернай лесвіцы, а ў 2010 годзе ўзначаліў завод.

У Кобрыне няма навучальнай установы, якая б рыхтавала спецыялістаў патрэбнага нам профілю. Таму некаторыя прыходзяць проста так, а некаторыя — напрыклад, пасля заканчэння Брэсцкага тэхнічнага каледжа. Адна з выгод, якую дае праца на «Гідрамашы», — магчымасць атрымаць месца ў інтэрнаце (ён разлічаны прыкладна на 300 жыхароў). Зусім нядаўна адзін з нашых супрацоўнікаў атрымаў ключы ад блока, дзе будзе жыць са сваёй сям'ёй.

Таксама на заводзе ёсць сталовая на 80 месцаў, якая працуе ў дзве змены.

УНП 200093330

Цэх станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем. На першым плане: аператары станкоў Дзмітрый МАНЮК, Андрэй РАМАНОВІЧ, Дзяніс КАРУНАС.

Калектыў бухгалтэрыі. На першым плане: Таццяна АСАЁНАК і Вольга СЦЕПАНЮК. На другім плане: Тамара ЯКІМОВІЧ, Іна ЛЫСЮК і Людміла ВЯРЭНІЧ.

КОБРЫНСКІЯ СЫРЫ: ЗАЎЖДЫ ТОЛЬКІ ЛЕПШАЕ

Для таго, каб пабываць на прадпрыемстве, пазнаёміцца з яго працаўнікамі, мелася, як мінімум, дзве нагоды. Па-першае, марка «Кобрынскія сыры» вядомая як у нашай краіне, так і за яе межамі. А па-другое, ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» — адзінае ў рэспубліцы прадпрыемства малочнай перапрацоўкі, якое працуе з рэнтабельнасцю продажу 15,3 працэнта. Цікава было даведацца, у чым жа сакрэт такіх высокіх паказчыкаў? Аказалася, нічога незвычайнага тут няма. Складнікі першага ў многім і вызначаюць вышыню другога. Але пра ўсё па парадку.

Дырэктар Мікалай МІСЮК.

Парада чытачам газеты ад галоўнага тэхнолага Валянціны Дацкевіч: *Культура ўжывання сыру ўключае ў сябе некаторыя сакрэты. Вось адзін з іх: ніколі не падавайце на стол сыр адразу з халадзільніка. Прадукт трэба патрымаць пры пакаёвай тэмпературы да адной гадзіны, тады найлепш раскрыецца яго водар і смак.*

ЗАВОД — ГЭТА ЛЮДЗІ

— Найпершая наша каштоўнасць — гэта людзі, — сказаў на самым пачатку размовы дырэктар прадпрыемства Мікалай МІСЮК. — Нават на суперсучасным абсталяванні не атрымаеш жаданага выніку, калі не будзе адказнасці кожнага за галоўнае — якасць прадукцыі. Таму, як бы банальна гэта ні гучала, важна працаваць з душой. І ў нас гэта ўмеюць.

Калектыў завода сёння налічвае 631 чалавека. Сярэдні ўзрост — 37 з паловай гадоў. Сярод моладзі шмат тых, хто вучыцца, атрымлівае першую, а то і другую вышэйшую адукацыю з прыцэлам атрымаць больш прэстыжную і высокааплатную пасаду. І ўсё гэта магчыма. Нездарма ж на заводзе складваюцца працоўныя дынастыі. Зараз іх больш за дзясятак. І такая практыка заахвочваецца. Калі на прадпрыемстве працуюць або працавалі бацькі, дзеці атрымліваюць прэферэнцыі пры конкурсе кандыдатаў. Так з асяродку аднадумцаў, падобных па характары людзей, складваюцца калектывы цэхаў, брыгад, іншых падраздзяленняў. А выпадковыя людзі, сцвярджаюць тут, адсейваюцца прыкладна за паўгода.

Намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях Вольга Янкоўская расказвае: «Бывае, прыедуць калегі, просяць паказаць ім вытворчасць, кажуць, што хочуць зрабіць такі сыр, як у Кобрыне. Але ж гэта марныя намаганні. Так, як у Кобрыне, не будзе, бо смак і якасць прадукцыі дасягаецца шматгадовымі напрацоўкамі, у аснове якіх стаяць традыцыі». Вольга Рыгораўна працуе на заводзе амаль тры дзясяцігоддзі. І з вялікай павагай гаворыць пра папярэднікаў, традыцыі якіх працягвае і развівае цяперашні калектыў. Таму, лічыць яна, можна паказаць абсталяванне, вытворчы працэс, расказаць пра асаблівасці тэхналогіі, але стаўленне людзей да справы, тое, што ўкладвае кожны працаўнік у вытворчасць, калегам не перадасі. Да гэтага кожны павінен ісці сваім шляхам, не заўсёды кароткім і роўным.

Намеснік дырэктара Вольга ЯНКОЎСКАЯ.

Прадавец фірменнага павільёна «Верас» Лізавета ЯЧНІК.

Выкрабляльнік тварагу Вольга МАКСІМЧУК.

ЯКАСЦЬ — СТРАТЭГІЯ І ІДЭАЛОГІЯ

А якасць на Кобрынскім масларобна-сыраробным заводзе стала стратэгіяй вытворчасці, яе, калі хочаце, ідэалогіяй. Нездарма ж на сцягу прадпрыемства накрэслены словы: «Заўжды толькі лепшае». Асноўная прадукцыя завода — сыр. Яго зараз выпускаюць больш за 20 відаў. У суткі адпаведны цэх выдае 18 тон сыру, у сезон вялікага малака даходзіць да 25 тон. «Асартымент — справа вельмі рухомая, — заўважае дырэктар завода Мікалай Місюк. — Мы ўвесь час арыентуемся на густ спажыўца. Прыйдзецца даспадобы пакупніку пэўны сорт — яго актыўна набывае гандаль, потым можа быць спад цікавасці, а неўзабаве пакупнік вяртаецца да ўлюбёнай маркі зноў.

Больш за 70% малака, атрыманага ад гаспадарак, ідзе на выраб сычужных сыроў. І некаторыя маркі карыстаюцца такім попытам, што сярод гандлёвых партнёраў з'яўляюцца ахвотныя прысвоіць гандлёвую марку ці, прасцей кажучы, украсці яе. Так было нядаўна з уласнай распрацоўкай — сырам «Чорны прынц». Давялося актыўна пазмагацца за сваё. Але ж гэта выдаткі сённяшніх, не заўсёды добрасумленных і цывілізаваных, рынкавых адносін. Такія цяжкасці тут навучыліся пераадольваць. І паступова развіваюць вытворчасць далей.

Ужо ёсць першыя вопытныя партыі цвёрдага сыру тыпу «Пармезан». А літаральна днямі зварылі першую прамысловую партыю, якая пойдзе ў рэалізацыю. Да гэтага новую прадукцыю старанна вывучалі, на адной з дэгустацый быў нават прадстаўнік Еўрасаюза. «Але станоўчымі ацэнкамі, якія мы атрымалі ад спецыялістаў, не вельмі цешымся, — разважае Мікалай Сцяпанавіч. — Галоўнае — ацэнка спажыўца. Яна — напарадзе, мы вельмі хвалюемся за яе. Можна зрабіць якасны, карысны, нятанны прадукт, але менталітэт пакупніка акажацца не гатовы яго ацаніць — і вытворца застанецца ў прайгрышы. Але як бы ні было, ва ўрон якасці мы не дазваляем сабе ніводнага мерапрыемства ні пры якіх умовах».

АДМЫСЛОВАЯ СЯРПЯНКА І ІНШЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

Аб прыярытэце якасці за дзень знаёмства давялося пачуць шмат разоў ад многіх людзей. Лілія Рубанюк, прасоўшчык сыраробнага цэха, з любоўю і гонарам расказвала пра сваю работу. Лілія Вячаславаўна паказала нам сярпянку — адмысловую тканіну, у якую загортваецца кожная будучая галоўка сыру пры фармаванні. З дапамогай сярпянкі абрысы сыру набываюць асаблівы сетчаты малюнак, які робіць яго адметным. Гэта адна з кобрынскіх традыцый. Карані яе паходзяць яшчэ са старадаўніх рэцэптаў прыгатавання сыру. Лілія Рубанюк расказала, што на прадпрыемстве працуе 16 гадоў. Работа нялёгкая, у справе сыравара шмат яшчэ застаецца ручной працы. Але жанчына прывыкла, палюбіла сваю справу. У свой час з дапамогай прадпрыемства вырашыла жыллёвае пытанне, і цяпер не ўяўляе свайго лёсу па-за межамі завода.

Галоўны тэхнолаг Валянціна ДАЦКЕВІЧ.

Паводле слоў галоўнага тэхнолага Валянціны Дацкевіч, у вопытных майстроў вучацца маладыя. Да таго ж кожная варка сыру суправаджаецца спецыялістам, таму выпадковасцяў амаль не бывае. А заводская камісія па якасці, якая дэгустуе прадукцыю раз на два тыдні, уяўляе сабой самы строгі і прыдзірлівы кантрольны орган.

Начальнік аддзела кадраў і інфармацыйнай работы Людміла ДАРАФЕЕВА.

Начальнік кампрэсарнага цэха Эдуард ГРЭНЬ.

МАДЭРНІЗАЦЫЯ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Вядома, калі прадпрыемства стабільна працуе, яно праводзіць паступовую мадэрнізацыю вытворчасці. Так, за апошнія гады было набыта сучаснае абсталяванне для вытворчасці тварагу і мяккіх сыроў. Сучасную лінію атрымаў цэх па вытворчасці цэльнамалочнай прадукцыі, іншыя вытворчасці. Усё гэта паспрыяла пашырэнню асартыменту, паляпшэнню вонкавага выгляду прадукцыі, паявілася больш магчымасцяў для ўвасаблення дызайнерскіх распрацовак. Цяпер на парадку дня — мадэрнізацыя кацельнай гаспадаркі і кампрэсарнага цэха.

Начальнік кампрэсарнага цэха Эдуард Грэнь расказаў, што цэх перажывае поўнае абнаўленне. Зараз ідзе работа па замене халадзільнага абсталявання. На змену старой халадзільнай установцы, якая змяшчала шэсць тон аміяку, манціруецца новая, якая змяшчае менш за 900 кілаграмаў небяспечнага рэчыва. Такая замена, па-першае, вырашае задачу бяспекі горада, а па-другое, памяншае спажыванне электраэнергіі на 10-15% пры той жа выпрацоўцы холаду. Новае абсталяванне ўстанаўліваюць з прыцэлам на будучыню, яно дасць магчымасць павялічыць магутнасці прадпрыемства на трэць. Бо завод фактычна стаіць на парозе новага грандыёзнага інвестыцыйнага мерапрыемства, якім стане будаўніцтва новага сырцэха. Зараз аб'яўлены тэндар. Ідзе работа па выбары праекціроўшчыка і ўзгадненні праекта. Паводле папярэдніх планаў, будаўніцтва мяркуецца завяршыць да канца 2015 года. Тады завод, несумненна, атрымае новае дыханне і выйдзе на новы ўзровень вытворчасці, але тут маюць намер захаваць свае шматгадовыя традыцыі і напрацоўкі.

Перспектывы завода — не толькі клопат яго кіраўніцтва. Як паказвае ананімнае анкетаванне працаўнікоў, якое перыядычна праводзіцца ў цэхах і на вытворчасцях, будучыняй заклапочаны ўсе члены калектыву. Бо для кожнага з іх завод — гэта найперш работа і годнае ўзнагароджанне за яе, магчымасць утрымліваць і выхоўваць дзяцей, а для вельмі многіх яшчэ і магчымасць пабудаваць жыллё. Дырэктар часта гаворыць сваім падначаленым аб тым, што як з малых праблем вырастаюць вялікія, так і з малых поспехаў складваецца адзін вялікі поспех. Калі працаваць адказна на кожным напрамку, то і атрымаецца адзін агульны вынік. Так, як было, напрыклад, у справе эканоміі і беражлівасці. Завод атрымаў прэмію аблвыканкама за другое месца па названых паказчыках. І гэтай узнагародай ганарацца, бо яна заслужаная, за ёй стаіць працоўны ўдзел большасці завадчан. Вось так, калі кожны адчувае сваё дачыненне да агульнага выніку, у тым ліку і на ўласным кашальку, то стымул — працаваць лепш — набывае рэальныя рысы.

Тры гады таму завод адзначыў 70-годдзе з дня ўтварэння. За гэты час завадчане здабылі прэстыж сваёй прадукцыі на ўнутраным рынку краіны і ўпэўнена перайшлі на асваенне новых рынкаў. Мікалай Сцяпанавіч Місюк узначальвае прадпрыемства чатыры гады. Кажа, што працаваць цікава. Не тое што год на год, але месяц на месяц не падобны. Планы, якія складаюцца на пачатак кожнага месяца, даводзіцца карэктаваць ледзь не кожны тыдзень. Маркетынгавая палітыка, эканоміка часам нагадваюць хадзьбу па канаце, дзе чаго б гэта ні каштавала, трэба ўтрымаць раўнавагу. Яшчэ трэба ўмець лічыць, і гэту навуку, здаецца, тут паспяхова асвоілі. Бо нават за апошнія гады перажылі многае: уплыў сусветнага крызісу, наступствы так званых «малочных войнаў», ваганні курсаў валют. Наперадзе чакаюць новыя рэбусы, якія абяцае паднесці жыццё, напрыклад, уступленне аднаго з асноўных гандлёвых партнёраў — Расіі — у Сусветную гандлёвую арганізацыю. Але да вырашэння новых задач і кіруючая каманда, і калектыў Кобрынскага масларобна-сыраробнага завода гатовы.

Маркетолаг Наталля ПАЎЛЮКАВЕЦ.

НОВЫ ДОМ, САЦЫЯЛЬНЫ ПАКЕТ

Каля новага 40-кватэрнага дома кааператыву «Малочнік», які здадзены летась, мы спыталі аднаго з навасёлаў (ім аказаўся вадзіцель завода Аляксандр Селех), як ён ацэньвае перспектывы прадпрыемства. Аляксандр сказаў так: «І я, і мае суседзі-калегі ўпэўнены: завод будзе жыць і развівацца, а значыць, і заўтра ў нас будзе работа і магчымасць выплачваць крэдыт. А наогул наш дом і ёсць яскравае сведчанне стану завода. Прадпрыемства дапамагло сфарміраваць кааператыў, атрымаць пляцоўку. Мы ўзялі крэдыт пад 1%, нам цяпер іншыя гараджане па-добраму зайздросцяць. Дом цагляны, кватэры прасторныя, сучаснай планіроўкі. Што называецца: жыві і працуй на карысць сваёй сям'і».

Варта дадаць, што гэта трэці заводскі дом, пасля яго ўвядзення ў строй нават часова знікла чарга на жыллё. А для новых несямейных спецыялістаў і рабочых ёсць інтэрнат. Вядома, жыллё — галоўнае для любога работніка. Ёсць і іншыя бонусы ў супрацоўнікаў адкрытага акцыянернага таварыства. Так, абеды ў заводскай сталовай недарагія, смачныя. Побач знаходзіцца буфет-магазін, дзе можна набыць сваю прадукцыю без гандлёвай нацэнкі, а таксама выпечку, іншыя прадукты. Пра здароўе работнікаў клапоцяцца не толькі ўласны медпункт з масажным, стаматалагічным, іншымі кабінетамі. Ёсць свая трэнажорная зала, ахвотныя могуць наведваць басейн. Старшыня прафсаюзнага камітэта Вольга Кавалевіч паведаміла, што сёлета ўсе, хто пажадаў, атрымалі пуцёўкі ў летнія лагеры для дзяцей за дзясятую частку іх поўнага кошту. Каля 30 чалавек у першым паўгоддзі прайшлі комплекс санаторных працэдур у мясцовым аквапарку. Прадпрыемства дае магчымасць займацца спортам на карысць здароўю кожны дзень.

Тэхнолаг Наталля ГЕРЛІЧКА з сям'ёй нядаўна засяліліся ў новы дом на вуліцы Дружбы. Амаль усе навасёлы гэтага дома — працаўнікі прадпрыемства.

Ну а што датычыць матэрыяльных заахвочванняў і дапамог, іх ёсць цэлы спіс, які замацаваны калектыўным дагаворам. Гэта звязана з юбілейнымі датамі, сямейнымі ўрачыстасцямі і іншымі падзеямі. Не забываюць у калектыве пенсіянераў, ветэранаў вытворчасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК, фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.
УНН 200093343

МАРОЖАНАЕ СА СМАКАМ ДЗЯЦІНСТВА

Натуральнасць і якаснасць — тое, за што нас любіць пакупнік, — неаднойчы падкрэслівалі на заводзе. І не толькі калі гаворка ішла аб вытворчасці сыроў. Прадпрыемства выпускае каля паўтары сотні найменняў прадукцыі. Гэта і традыцыйныя малако з кефірам, масла, тварагі, ёгурты, плаўленыя сыры, марожанае. Дарэчы, апошняе вырабляецца толькі з цэльнага малака і салодкіх вяршкоў. Каштавалі і сведчым, што кобрынскі пламбір у вафельным кубачку з тонкім, амаль няўлоўным водарам ванілі і свежых вяршкоў нагадвае паўзабыты смак далёкага дзяцінства.

Ведае пакупнік і соусы, маянэзы мясцовага прадпрыемства. З установцай новага імпартнага абсталявання якасць названай прадукцыі значна палепшылася. Асаблівасць іх — густая і мяккая кансістэнцыя. Тут часам нават ідуць на наўмыснае павелічэнне сабекошту, купляючы дарагую сыравіну на карысць якасці. Бо нават сярэдненькі па характарыстыках прадукт сабе ўжо дазволіць не могуць.

На новай лініі вакуумнай упакоўкі Ніна ХВЯСЮК і Ірына ГАЎРЫЛЮК.

Марына СУХАРЭВІЧ на аўтамаце ўпакоўкі.

Прасоўшчык Лілія ЛЮБАНЮК.

Аператар упаковачна-расфасовачнага аўтамата Яўген ЛІВАНДОЎСКІ.

Дзівінскі абрус засцілае свет

Прадпрыемства — пераможца абласнога і раённага конкурсаў «Лепшы прадпрымальнік Брэсцкай вобласці» 2007—2009 гадоў, мае дыпломы як лепшае прадпрыемства — арганізатар новых працоўных месцаў, за продаж спажывецкіх тавараў «Купляйце Беларускае!», пераможца конкурсу ў сферы вытворчасці спажывецкіх тавараў.

Замежнае прадпрыемства «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» было створана ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна ў верасні 2005 года. Фірма-заснавальнік з Германіі спецыялізуецца ў вобласці хатняга і гасцінічнага тэкстылю ўжо 180 гадоў і з'яўляецца найбуйным вытворцам і пастаўшчыком прадукцыі ва ўсе краіны свету. «Лангхайнрых» — гэта добрая якасць, якая забяспечваецца найноўшымі тэхналогіямі ткацкай вытворчасці і вопытам лепшых ткачоў. У гэтым сакрэт яго перадавых пазіцый на сусветным рынку. Класіка і сучаснасць арганічна спалучаюцца ў калекцыях «Лангхайнрых». Эксклюзіўныя вырабы могуць выканаць па індывідуальных праектах. Напрыклад, па пажаданні буйных атэляў і рэстаранаў высокага класа, авія- і чыгуначных кампаній — са спецыяльна вытканымі эмблемамі і лагатыпамі.

Зараз прадукцыя «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» распаўсюджваецца і на ўнутраным рынку Беларусі. Жыхары Кобрына і Брэсцкай вобласці выказалі вялізную цікавасць да прадукцыі. Імкнучыся ўключыць у сферу сваіх інтарэсаў беларускі рынак і задаволіць попыт мясцовага спажыўца, прадпрыемства адкрыла ў Кобрыне сваю фірменную краму.

— Менавіта таму, што нашы працаўніцы шыюць вельмі якасныя абрусы, сурвэткі і бялізну, вытворчасці, аналагічнай нашай, няма ні ў Кітаі, ні ў іншых краінах, — генеральны дырэктар ЗТАА «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» Валянціна Шугай не перабольшвае, а прыводзіць канкрэтныя прыклады. — Дарэчы, вядомая авіякампанія «Lufthansa» замаўляе ў нашых заказчыкаў, пакінуўшы кітайскіх. Для кампаніі вельмі важная якасць прадукцыі, а яна вырабляецца рукамі нашых беларускіх жанчын. Наша прадукцыя ёсць і на Кіпры, і ў Эміратах, і ў Балгарыі — паўсюль. У Расію раней яна ішла праз Германію, Фінляндыю. А цяпер дзякуючы мытнаму саюзу нашы заснавальнікі далі нам права прадаваць вырабы напрамую. Паміж Расіяй і Беларуссю няма мытных афармленняў, і ўрэшце валютная выручка прыходзіць у Беларусь.

За грошы і па сумленні

— У адну адгрузку мы 300-400 найменняў вырабаў адпраўляем. Для нас няма паняцця «мінімальны заказ». Калі нехта замовіў адну сурвэтку і адзін абрус, мы гэта выконваем і адпраўляем заказчыку. Выкарыстоўваем 4 тысячы найменняў тканін. Шыем што заўгодна: з ражком, з мярэжкай, з вышыўкай... Вельмі шмат заказаў зараз, — расказвае Валянціна Рыгораўна. — Таму і супрацоўніцам нашым прыходзіцца вельмі многа працаваць. Людзі самі прапануюць на гадзіну падоўжыць працоўны дзень. Яны заўсёды атрымліваюць за любую гадзіну перапрацоўкі двайную плату — усё па законе. Па згодзе з усім калектывам першая змена на працу прыходзіць раней на гадзіну, а другая — сыходзіць на гадзіну пазней. Наш заказчык, ён жа заснавальнік, вельмі задаволены. І людзі ўсе зацікаўлены, кожны вельмі цэніць сваю працу. Былі сітуацыі, калі мы думалі, што не справімся: заказ трэба было выканаць у вельмі сціслы тэрмін. Аднак людзі самі да мяне прыйшлі і гавораць: «Валянціна Рыгораўна, мы будзем працаваць па 12 гадзін, калі трэба». Я падумала: людзі так добра аднесліся да працы, чаму б і іх не заахвоціць? І пачала прывозіць ім гарачыя абеды з рэстарана — каб было зручна, бо гэта ж вельмі цяжка — працаваць па 12 гадзін. Мы выканалі той заказ, хаця ён быў і няпросты. Нават заснавальнік наш здзівіўся і быў вельмі задаволены.

Шматрукія майстрыхі

Швейная вытворчасць — вельмі спецыфічная. Спецыялісты гавораць: каб звычайны радок шыць упэўнена, трэба доўга вучыцца. Таму на нямецка-беларускім прадпрыемстве цэняць тых, хто валодае навыкамі бездакорна. Многія з работніц, дарэчы, паралельна асвойваюць і іншыя сумежныя спецыяльнасці. Некаторыя валодаюць нават чатырма — гэта швачка, раскройшчык, упакоўшчык, укладчык... Калі што, могуць замяніць адна адну на вытворчасці.

— Калі чалавек атрымлівае дастойны заробак, ён задаволены сваёй працай, — адзначае Валянціна Рыгораўна. — Адпаведна, ён будзе ствараць і добры прадукт. Чалавек, які чымсьці не задаволены, так і працуе, такая і аддача ад яго. У нас здзельна-прэміяльная форма аплаты працы, таму людзі атрымліваюць ад 3 да 5 мільёнаў беларускіх рублёў. Кожны зарабляе якраз столькі, колькі напрацаваў. Людзі ведаюць усе расцэнкі, і, калі нешта хто прапусціў, падкажуць самі. Гады два таму была сітуацыя, калі ў пачатку года не было заказаў. Людзей не адправілі ў адпачынак «за свой кошт». Яны атрымлівалі грошы за тое, што мы ім не прадаставілі працу — як за вымушаны прагул.

Няма таго, што раней было

Між тым, 7 гадоў таму ў вялізнай вёсцы Дзівін, якая ад Кобрына знаходзіцца на адлегласці 33 км, ад Брэста — амаль 80 км, стаяў закінуты будынак былога Дома быту. З населенага пункта, дзе жыве 3,5 тысячы чалавек, раённым уладам бясконца скардзіліся на адсутнасць працы жанчыны, былыя швачкі. Таму, калі будынкам памерам 1248 квадратных метраў зацікавіліся нямецкія бізнэсмены, ім далі магчымасць набыць гэтае памяшканне. З надзеяй, што кваліфікаваныя кадры набудуць новыя працоўныя месцы. Спраўдзілася. Пра тое, з чаго пачыналі аднаўленне лёгкай прамысловасці ў Дзівіне, цяпер нагадваюць толькі фотаздымкі: на іх абшарпаныя сцены і дах, які праваліўся. Сёння ж фабрыка патанае ў кветках. З-за бяроз відаць акуратны, з густам пафарбаваны будынак. Побач — невялічкі фантан, возерца з мастком і месцы для летняга адпачынку ў спякоту. На ўваходзе кожнага сустракае старажытная сапраўдная швейная машынка вытворчасці знакамітай нямецкай фірмы. Тут яна і помнік, і сімвал.

— Людзі ў нас вельмі працавітыя, — працягвае свой расказ аб калектыве генеральны дырэктар Валянціна Шугай. — Тыя, хто прыйшоў сюды працаваць 7 гадоў таму, верныя вытворчасці і дагэтуль. У нас няма цякучкі кадраў. Прафесіяналаў, якія тут жылі з самага пачатку стварэння прадпрыемства, мы толькі навучылі новым тэхналогіям і вырабу новых відаў прадукцыі. Гэта не было складана. Цяпер у нас больш за 130 чалавек працуе. Сёлета мы зноў набіраем людзей, нам патрэбна яшчэ 12 працаўніц.

...А ў 2005-м праз фонд стварэння новых працоўных месцаў прадпрыемства атрымала 200 мільёнаў рублёў беспрацэнтнай пазыкі. Пад гэтыя сродкі на працу прынялі 40 беспрацоўных, купілі швейныя машынкі. Паступова разлічыліся з дзяржавай. Дарэчы, нямецкі бок быў здзіўлены, што дзяржава дапамагае замежным прыватным прадпрыемствам. Зараз неабходнае абсталяванне для вытворчасці тут купляюць без крэдытаў і шукаюць шляхі далейшага пашырэння. Гавораць, як мінімум 20 працоўных месцаў створаць у бліжэйшай будучыні.

— Калі мы ствараліся, яшчэ не было дакументаў, якія даюць ільготы вясковым прадпрыемствам. Гэта ўжо пасля таго, як пачалі дзейнічаць, нас уключылі ў гэты спіс. Таму мы пакуль не плацім падаткі на прыбытак, на нерухомасць... Грошы накіроўваем на развіццё: закупляем абсталяванне, лепшыя ўмовы працы для людзей ствараем...

Заахвочванне для кожнага

Працаўнікі ЗТАА «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» не толькі маюць поўны сацыяльны пакет — ім прадпрыемства аказвае матэрыяльныя дапамогі. Тут стала добрай традыцыяй ушаноўваць юбіляраў: 50-годдзе «прэміруецца» 10 базавымі велічынямі, 55 або 60 гадоў — 15 і 20 базавымі, атрымліваюць матэрыяльныя ўзнагароды за добрасумленную працу, ушаноўваюць маладыя сем'і ў дзень шлюбу. Прэміі і падарункі да свят — 8 Сакавіка, 23 лютага, Новага года, Дня работнікаў лёгкай прамысловасці — таксама атрымліваюць у абавязковым парадку. У тым ліку і тыя жанчыны, якія знаходзяцца ў дэкрэтным водпуску:

— Матэрыяльную дапамогу мы аказваем людзям ва ўсіх неабходных жыццёвых выпадках, у тым ліку на гародніну. Тым, хто мае патрэбу, выдаём беспрацэнтную пазыку. Напрыклад, газ некаторыя праводзілі, грошы былі патрэбны. Мы заключаем у такім выпадку дагавор на поўгода ці на год, потым пакрыху ўтрымліваем з заробку. Калі можам дапамагчы свайму супрацоўніку ў цяжкую хвіліну — абавязкова дапамагаем. Дарэчы, нашы заснавальнікі разумеюць такі падыход, бо задаволены працай людзей. А чалавек, калі цэніць сваю працу, будзе імкнуцца развівацца і вучыцца, — працягвае расказ генеральны дырэктар Валянціна Шугай. — Я сама пачынала працоўны шлях з самых нізоў і ведаю ўсе цяжкасці жыцця і розныя праблемы чалавека. Калі чалавек хоча вучыцца, мы даём аплачваемы водпуск — 40 дзён у год. Прычым нават тады, калі чалавек вучыцца не па профілі прадпрыемства. Я сама зараз студэнтка, і мне заснавальнік таксама аплачвае водпуск. Таму і людзям прадастаўляю аналагічную магчымасць. Што тычыцца павышэння кваліфікацыі, семінараў — толькі жаданне, я заўсёды вітаю ініцыятыву. Многія імкнуцца павышаць кваліфікацыю, разрад, атрымліваць сумежную прафесію.

Валянціна Рыгораўна ўпэўнена, што людзі не толькі працаваць павінны, але і адпачываць:

— Для іх патрэбна абавязкова ствараць нейкую радасць у жыцці. Я, напрыклад, ганаруся тым, што 61 супрацоўніка прадпрыемства звазіла ў Пачаеўскую лаўру. Дарэчы, калі заходзіла ў цэх, заўсёды прапанавала ёй з'ездзіць падлячыцца. Заўсёды, калі ёсць праблемы, мае супрацоўнікі ведаюць, што можна прыйсці, пагаварыць і вырашыць. Ніхто не застанецца без увагі.

Генеральны дырэктар ЗТАА «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» Валянціна ШУГАЙ

Генеральны дырэктар Валянціна Рыгораўна ШУГАЙ.

Нарадзілася ў вёсцы Белавуша Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння Столінскага сельскагаспадарчага тэхнікума пачынала працоўную дзейнасць бухгалтарам у калгасе імя Дзяржынскага вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна.

— У маім жыцці было вельмі многа прадпрыемстваў. Так здарылася, што прыходзілася часта мяняць працу. Працавала ў сферы бытавога абслугоўвання, на швейнай вытворчасці, у сельгастэхніцы, у будаўнічай арганізацыі, на мясакамбінаце. Маю вопыт працы ў нямецкай фірме, якая вырабляла труны, і нават на страусінай ферме. Я прайшла добрую школу самай рознай вытворчасці, працавала з вельмі цудоўнымі кіраўнікамі, якім дагэтуль удзячная і з якіх бяру прыклад. Штосьці для сябе заўважала: як трэба, як не трэба... Відаць, самае галоўнае ў жыцці, што я ніколі не баялася, што не спраўлюся. Ніколі не лічылася з асабістым часам, магла працаваць суткамі, калі ведала, што трэба. Было ўсялякае ў маім жыцці, але ж людзі заўсёды дапамагалі. Зараз заканчваю прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва па спецыяльнасці «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве».

Намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці Святлана НІЧЫПАРУК.

лавека. Тым больш, у такім дружным калектыве людзей падводзіць сорамна. Здаралася, што ў нялёгкай сітуацыі калектыў браў на парукі жанчыну, якая мае траіх дзяцей. Працуе ў нас маладая жанчына-інвалід. Мы ёй купілі пуцёўку і адправілі адпачываць бясплатна. Чалавек вельмі старанны і таму я сама прапанавала жанчынам з'ездзіць на якую-небудзь экскурсію. Прапанавала розныя варыянты. Яны выказалі жаданне — у знакаміты манастыр ва Украіне. Заказала 2 аўтобусы ў аўтапарку, і мы з'ездзілі ў Пачаеў, наведалі жаночы манастыр, былі на крыніцы. Усе засталіся задаволены. Цяпер яны мараць, што мы зноў куды-небудзь разам паедзем.

Пасцельная бялізна фірмы «Лангхайнрых» адрозніваецца даўгавечнасцю і вытанчанасцю, лёгка мыецца, пры гэтым захоўвае першапачатковую форму і колеравую гаму малюнкаў. Таму яна з'яўляецца лепшай для працяглага выкарыстання ў сэрвісным абслугоўванні. Менавіта з-пад рук дзівінскіх майстрых выходзяць дзівосныя вырабы, якія служаць мільёнам людзей ва ўсім свеце.

Швачка Крысціна ТУРЫНОВІЧ.

Дзеці працы не перашкода

Генеральны дырэктар ЗТАА «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» прымае жанчын на працу, нават калі ведае, што яны цяжарныя. Больш за тое, Валянціна Рыгораўна вельмі радуецца, што жанчыны хочуць мець больш дзяцей:

— Няхай хочуць дзяцей! Народзяць і потым прыйдуць зноў да нас працаваць. Я ж прайшла сама праз сітуацыю, калі мяне калісьці не бралі на працу, бо маладая, хутка ў дэкрэт, а потым маленькія дзеці... А я лічу, што гэта нармальна, няхай сходзяць у дэкрэт, потым вернуцца зноў на нашу вытворчасць. Тым больш, не прадпрыемства ж ім плаціць дапамогу. У нас зараз працуе дзяўчына, у якой зусім малое дзіця. Яна прыходзіць працаваць на 4 гадзіны. Калі ласка, і так магчыма.

У сваім калектыве дырэктар не толькі ведае кожнага, але і лічыць, што за кожнага ў адказе. І праблемы выхавання, калі так можна казаць пра людзей дарослых, — таксама яе асабісты клопат. Людзі розныя, і лёсы розныя.

— Працуе ў нас бацька, які адзін застаўся з двума маленькімі дзецьмі пасля таго, як загінула яго жонка, — расказае Валянціна Шугай. — Цяжка чалавеку было, прыходзілася яго выклікаць да сябе, гутарыць. Зараз нармальна жыве. Былі выпадкі, калі і жанчыны схіляліся да п'янства. З імі прыходзілася працаваць асобна. Хтосьці закадзіраваўся, хтосьці сам перастаў піць. Перш чым выганяць, трэба паспрабаваць выправіць чалавека. Тым больш, у такім дружным калектыве людзей падводзіць сорамна. Здаралася, што ў нялёгкай сітуацыі калектыў браў на парукі жанчыну, якая мае траіх дзяцей. Працуе ў нас маладая жанчына-інвалід. Мы ёй купілі пуцёўку і адправілі адпачываць бясплатна. Чалавек вельмі старанны і таму я сама прапанавала ёй з'ездзіць падлячыцца. Заўсёды, калі ёсць праблемы, мае супрацоўнікі ведаюць, што можна прыйсці, пагаварыць і вырашыць. Ніхто не застанецца без увагі.

Праграмны падыход

— Спачатку немцы лічылі, што ўсё ведаюць толькі яны, а беларусаў трэба падрабязна вучыць, як правільна працаваць, — успамінае Валянціна Рыгораўна пачатак сваёй работы на замежным прадпрыемстве. — Я згодная, многаму, безумоўна, нам прыйшлося вучыцца. А вось аднойчы яны прывезлі сюды з Германіі спецыяліста, які павінен быў навучыць хуткаму ўліку і афармленню тканін. А некалькі раней мы з праграмістам напісалі сваю камп'ютарную праграму па ўліку тканін. Дзякуючы ёй усе дакументы апрацоўваюцца аўтаматычна і ў канцы трэба толькі аформіць маршрутны ліст. Я, вядома, паслухала спецыяліста з Германіі, а потым прапанавала паглядзець, які ўлік у нас. Паказала, расказала, пасля чаго ён кажа: «І нам такая праграма патрэбна». Дарэчы, гэтая праграма, як і ўвядзенне здзельна-прэміяльнай формы аплаты, прывялі да вельмі хуткага павелічэння прадукцыйнасці працы. Пасля гэтага выпадку заснавальнік перастаў умешвацца ў кіраўніцтва нашым прадпрыемствам: стаў давяраць. Яны засталіся задаволеныя, што калісьці мяне ўзялі на працу. Калі я сёння людзям даю матэрыяльную дапамогу ці павялічваю заробак, я толькі паведамляю аб гэтым заснавальніку. Ён давярае, бо бачыць канчатковы вынік і цяпер ганарыцца беларускім праектам. Прадпрыемства прыносіць нядрэнны прыбытак. Некаторыя гавораць пра нашых заснавальнікаў: вось, яны выкарыстоўваюць танную працоўную сілу. А я кажу: мы павінны быць удзячныя, што яны стварылі прадпрыемства, капітальна адрамантавалі памяшканне, далі магчымасць людзям працаваць і атрымліваць дастойны заробак.

Асабісты шлях

— Сюды на працу на пасаду галоўнага бугалтара я прыйшла праз цэнтр занятасці. Гэта потым мяне ўгаварылі заняць дырэктарскае крэсла, бо былы кіраўнік Уладзімір Сяргеевіч Іскорцаў жыў у Мінску. Мне заўсёды хацелася прыйсці на прадпрыемства, якое арганізоўваецца з самага пачатку. Калі сюды пераходзіла, мне казалі: маўляў, там такія людзі цяжкія... Хачу заўважыць: як ты да людзей — так і людзі да цябе. Цудоўныя жанчыны і вельмі добры калектыў! Працаваць з імі вельмі лёгка. Гавораць, што чалавек становіцца больш жорсткім, калі трапляе ў крэсла кіраўніка, — гэта няпраўда. Усё залежыць ад самога чалавека. У любой сітуацыі чалавек павінен заставацца чалавекам і любіць менавіта тых людзей, якія вакол яго. Трэба ў любой сітуацыі ўмець трымаць сябе ў руках, не пакрыўдзіць чалавека, нават калі ён цябе пакрыўдзіў. Умець дараваць і не насіць камень за душой. Што тычыцца жыццёвага крэда, ёсць верш, ён пра мяне:

Я живу, как умею.
Ни о чём не жалею.
Нахожу и теряю,
И с нуля начинаю.
Я бы вам рассказала,
Да меня не спросили,
Как порой предавали,
Даже те, кто любили.
Только я не сдавалась,
Я сквозь слёзы смеялась,
И чтоб там ни случилось,
Я собой оставалась...

УНП 290433952



Швачка Наталля ЕДАМАВА і спецыяліст па кадрах Вера МІЦКЕВІЧ.

Укладчык-упакоўшчык Галіна КАЗАКЕВІЧ.

Укладчык-упакоўшчык Марыя БРЫШТАЛЬ.

У 1832 годзе Георг Готліб Лангхайнрых заснаваў у гарадку Шліцы, які размешчаны ў маляўнічых лясах Усходняга Гесэна, ткацкую вытворчасць. Паступова невялікая фабрыка ператварылася ў буйное тэкстыльнае прадпрыемства.

ЭЛІТНАЯ БУЛЬБА З «АСТРОМІЧАЎ»

ОСТРОМИЧИ ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

Адкрытае акцыянернае таварыства — адно з найбольш перспектыўных гаспадарак не толькі ў Кобрынскім раёне, але і ў Брэсцкай вобласці. Агульная плошча сельгасугоддзяў складае амаль 4000 га, у тым ліку раллі — 2200 га. Бал зямлі — 30,9. У якасці прыярытэтных кірункаў дзейнасці ААТ «Астромічы» традыцыйна вылучаецца вытворчасць бульбы і малака. Штогод плошчы пад «другі хлеб» складаюць 200 гектараў.

— З кожнага куста не менш за 10 бульбін будзе, і 6 з іх буйныя, – адзначае галоўны агранам Уладзімір СІДАРУК.

— Заўважце: сёння ў нас дзень зарплаты. А людзей у калідоры няма. Бо зарплата нашым працаўнікам ідзе адразу на картку, **— дырэктар ААТ «Астромічы» Уладзімір Псышчаніца** шчыра ўсміхаецца і ў дадатак да агульнавядомых знаходзіць яшчэ адзін аргумент на карысць банкаўскіх картак. — Раней людзі стаялі па грошы і ў гэтай чарзе гублялі вольны час, які можна скарыстаць на ўласныя мэты. Цяпер нават за малако мы грошы людзям адразу на карткі пералічваем.

Уладзімір Уласавіч падкрэслівае, што сёння ў гаспадарцы тыя кадры, з якімі хочацца працаваць. Ён узначаліў гаспадарку амаль 6 гадоў таму, і, хоць у цэлым калектыў захаваўся, гайкі закручваць прыйшлося. Сёння ж усе ведаюць: калі запланавана праца — яна павінна быць выканана.

— І не трэба кулаком па стале стукаць. Любыя пытанні мы з людзьмі вырашаем на іх працоўных месцах — імкнёмся, каб не яны ў кантору ішлі, а мы да іх. Вось прыйшлі да нас хлопцы на практыку з Пружанскага сельгастэхнікума. Мне вельмі спадабаўся іх падыход да справы. Кажуць: «Мы спачатку хочам на трактары папрацаваць». З такіх, хто імкнецца і ў тэхніцы разабрацца, і ў людзях — з самага нізэйшага ўзроўню, потым кіраўнікі добрыя атрымаюцца!

Уладзімір Псышчаніца лічыць, што кожны павінен займацца сваёй справай. Яго асноўны доўг — арганізоўваць і заахвочваць тых, хто добра папрацаваў. У тым ліку прэміямі на справаздачным сходзе:

— Калі 4000 тон сёлета намалоцяць, сядуць у аўтобус і паедуць адпачываць у Адэсу. Яшчэ мы пабяцалі на назіральным савеце кожнаму па 1 мільёне рублёў прэміі па выніках уборкі жніва. Зарплата механізатара, калі ён 1000 тон намалоціць, складзе 10 мільёнаў. Так што хто працуе, той і зарабляе. Спецыялісты цэняцца на рабоце, і ад аддачы кожнага павялічваецца заробак. Хаця бывае, як і паўсюль, па-рознаму: адна даярка можа атрымаць 4 мільёны, а другая — 1 млн 700 тыс. Значыць, дрэнна спрацавала.

6 гадоў таму ў сельгаспрадпрыемстве налічвалася 250 чалавек. Сёння засталося 175. Уладзімір Псышчаніца ўпэўнены, што для гаспадаркі людзей дастаткова, і прыводзіць красамоўныя доказы:

— Тады атрымлівалі 2 200 кг малака на адну галаву жывёлы. Сёння колькасць працаўнікоў паменшылася, але атрымліваем 5,5 тысячы. Зерня малацілі 2000 тон, а сёлета атрымалі больш за 4000. Тэхніку за гэтыя гады мы аднавілі поўнасцю. Зараз у нас 5 новых зернеўборачных камбайнаў, 4 бульбаўборачныя, 2 новыя саджалкі. Плануем узяць пагрузчык са шматлікімі адаптарамі. Прэс-падборшчык саломы адзін купілі, яшчэ адзін патрэбна набыць. Мікрааўтобус трэба — каб людзей

Кладаўшчык бульбасховішча Вольга АЦЮСКІНА.

падвозіць на працу.

Дарэчы, пра людзей клопат пастаянны. Абеды ад вясны да позняй восені падвозяць у поле — гэта закон. Як і спецадзенне. На фермах устаноўлены пральныя машыны, каб адзенне можна было памыць на працоўным месцы.

Бульба — самая любімая культура ў Астромічах. Яе тут вырошчваюць у тым ліку і на насенне метадам верхавіннай мерыстэмы. У гаспадарцы ёсць лабараторыя, дзе свой шлях да спажыўца бульба пачынае ў прабірцы. Гэта такі спосаб хуткага размнажэння аздароўленага ад віруснай інфекцыі пасадкавага матэрыялу бульбы. Расліны выгадоўваюць з клетак кропкі росту ва ўмовах лабараторыі ў прабірках. Клубні папярэдне абеззараживаюць з дапамогай тэрмічнай апрацоўкі. Гэты метад дае магчымасць за сезон з аднаго клубня атрымаць шляхам чаранкавання вялікую колькасць расады. У першы год атрымліваюць дробныя клубні памерам з фасоль. На наступны год з іх вырастаюць паўнавартасныя, здаровыя расліны. Ураджай пры гэтым павышаецца на 30—50%. Навуковыя распрацоўкі падуласныя астроміцкім аграрыям, і аздароўлены пасадкавы матэрыял бульбы карыстаецца вялікай папулярнасцю не толькі ў суседніх сельгасгаспадарках, але і ў насельніцтва.

Гадоў 15, як гаспадарка ўпэўнена трымае званне вядучай па вытворчасці бульбы не толькі ў раёне, але і ва ўсёй Брэсцкай вобласці. Каб правільна захоўваць любімую ўсімі беларусамі гародніну, у Астромічах пабудаваны два бульбасховішчы з неабходным мікракліматам, разлічаныя на 3 тысячы тон. Летась з 200 га вырасцілі 4 тысячы тон. Сёлета чакаюць, што вынікі будуць яшчэ лепшымі. Астроміцкую элітную бульбу добра ведаюць паўсюль, таму праблем з рэалізацыяй звычайна няма. Харчовая бульба хутка рэалізуецца не толькі на сваіх рынках, але і за мяжу шлях трымае. Любяць яе нашы суседзі па Мытным саюзе — расіяне і казахі.

Дырэктар ААТ «Астромічы» Уладзімір Псышчаніца падкрэслівае, што, каб атрымліваць добрыя вынікі, трэба дасканала выконваць тэхналогію вырошчвання і шматлікіх апрацовак:

— Сёння вялікая адказнасць у нашай гаспадарцы ляжыць на аграхімічнай службе. Важна правільна прымяніць ядахімікаты. А гэта пачынаецца з пратраўлівання насення, потым хімпраполка добрымі прэпаратамі, потым апрацоўкі супраць шкоднікаў раслін і гэтак далей... Выконваць тэхналогію сёння трэба абавязкова, тады будзе парадак і ўраджай адпаведны.

Што тычыцца перспектыў галіны, Уладзімір Уласавіч упэўнены, што пашыраць плошчы пад бульбу зусім не трэба. Важна іншае: інтэнсіўная тэхналогія, якая дазволіць павышаць ураджайнасць і на існуючых плошчах:

— Калі ў севазвароце занадта многа бульбы, яна можа пачаць хварэць. На нашых 200 га ураджайнасць можна падняць і да 400 ц з га. Сёлета, плануем, не меньш за 250 ц будзе. Пры гэтай

Галоўны эканаміст гаспадаркі Іна АСТАПУК.

лічбе рэнтабельнасць бульбы складае 30%. А гэта вельмі добра.

Між тым, бульба — не адзіны кірунак развіцця гаспадаркі. Добрыя і хуткія грошы тут атрымліваюць ад вытворчасці малака. На землях гаспадаркі пэўныя плошчы адводзяцца яшчэ і пад цукровыя буракі, і, безумоўна, пад зерне. 1000 га займаюць зерневыя — хапае і на корм жывёле, і на продаж.

УНП 200224932

Дырэктар ААТ «Астромічы» Уладзімір Уласавіч Псышчаніца нарадзіўся ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння школы працаваў трактарыстам. Служыў 3 гады на ваенным караблі. Пасля арміі пайшоў вучыцца ў Пружанскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут і Горацкую акадэмію. Працоўную дзейнасць як спецыяліст пачынаў брыгадзірам, потым займаў пасаду галоўнага агранома, начальніка ўчастка, намесніка старшыні. У Драгічынскім раёне 4 гады быў кіраўніком адной з гаспадарак. Займаў пасаду намесніка дырэктара на мясцовай птушкафабрыцы. Амаль 6 гадоў як кіруе ААТ «Астромічы». Крэда: калі даў слова, яно павінна быць жалезным. Тады і ад іншых можна патрабаваць выкананне сваіх абавязкаў.

Віншаванне лепшых. Злева направа: камбайнер Юрый ПІЛІПОВІЧ, камбайнер Аляксандр ДЗЕШКА, дырэктар Уладзімір ПСЫШЧАНІЦА, камбайнер Іван НАЗАРЧУК, камбайнер Сяргей ДАЦУК.

Фінал жніва ў ААТ «Астромічы».

Матэрыялы выпуску падрыхтавалі: Ірына АСТАШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ, Ганна ГАРУСТОВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Марыі ЖЫЛІНСКАЙ, Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

■ Асабістае

БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДЗЕ — У СЭРЦАХ — НАЗАЎЖДЫ

Мінск прыняў дэбютны міжнародны турнір па хакеі памяці Руслана Салея

Хакей у маім жыцці з'явіўся яшчэ ў маленстве. Зімой. У тым узросце, калі ўсё, што было за межамі роднага Жодзіна, горада аўтабудаўнікоў, — дзіўнае і новае, казачнае, арыгінальнае. У запоўненым Палацы спорту я з захапленнем сачыў за гульнёй славутага мінскага «Цівалі», закрываў вушы ад глухіх гукаў фанацкіх барабанаў і дзівіўся спрытным прыёмам хакейных варатароў. Гэта быў пачатак. Вялікі хакей да мяне прыйшоў пазней, калі я пачаў цалкам усведамляць, што беларусы ў ім таксама хлопцы зусім не простыя. І важную ролю ў маім успрыманні, безумоўна, адыграў дуэт айчынных хакеістаў — Уладзіміра Цыплакова і, вядома, Руслана Салея. Для мяне, малога, яны былі недасяжнымі «зоркамі», спартсменамі, якія гуляюць у лепшым хакейным чэмпіянаце свету — НХЛ! Я збіраў газетныя выразкі, фотаздымкі. Але аднойчы ад сябра, сваяка Салея, трапіла чорна-белая паштоўка-фотакартка Руслана Салея ў форме «Анахайма Майці Дакс». На ёй яшчэ малады, але мужны

Бэтан Салей: «Ён аддаваў усе сілы камандзе і ганарыўся сваёй краінай».

Руслан выкатваецца з шайбай з-за варотаў. Менавіта такім ён і быў у маіх думках — рыцарам на лёдзе, які не баіцца любых перашкод, героем для дзяцей і аўтарытэтам для партнёраў. Такім і застаўся. «Анахайм», «Флорыда», «Каларада», «Дэтройт» (спіс амерыканскіх клубаў, за якія выступаў Салей), нават недасведчанаму скажа, што гэта ўзровень, на якім пратрымацца больш за дзесяцігоддзе, правесці больш за 900 матчаў) — паказчык працаздольнасці і добрага характару чалавека.

Між іншым, Расці, як называюць Салея за акіянам, трапіў у тамтэйшчы асяродак яшчэ ў сярэдзіне 1990-х — тады, калі ніхто ў нас не ведаў пра існаванне інтэрнэту і мабільных тэлефонаў. Аднак ён выцерпеў, вытрымаў і сваёй амерыканскай кар'ерай стаў добрым прыкладам для тых маладых, хто ўсур'ёз вырашыў прысвяціць жыццё спорту. Летась ён падпісаў кантракт з яраслаўскім «Лакаматывам». Аднак так і не згуляў ніводнага афіцыйнага паядынку за каманду. 7 верасня ён загінуў разам з таварышамі па камандзе ў авіякатастрофе пад Яраслаўлем. Узлётная паласа аэрапорта стала чорнай паласой для нашага хакея... «Гэта лепшы хакеіст за ўсю гісторыю Беларусі, — прызнаўся пасля катастрофы Міхаіл Захараў, экс-хакеіст зборнай Беларусі, трэнер мінскага «Юнацтва». — Такіх хакеістаў яшчэ доўга-доўга можа не быць».

* * *

Турнір памяці Руслана Салея сабраў у «Мінск-Арэне» тры добрыя каманды: наш «Дынама» і чэхаўскі «Віцязь», якія гуляюць у Кантынентальнай хакейнай лізе, а таксама жлобінскі «Металург» — чэмпіён Беларусі. Перамогу ў турніры святкавалі госці з Расіі, а «Дынама» наогул аказалася на трэцяй, апошняй пазіцыі. Толькі для большасці не вынік быў галоўным. Большасць хацела аддаць даніну памяці выдатнаму хакеісту. На турніры прысутнічалі сваякі і дзеці Руслана, а сын, Сандра, зрабіў сімвалічнае ўкідванне ў матчы адкрыцця трохдзённага першынства. Падчас цырымоніі ўзнагароджаная арэна не спыняла авацыі, хакеісты шчоўкалі клюшкамі аб лёд, а на экране беглі кадры з кар'еры Салея...

— Руслан любіў хакей, аднак больш цаніў стасункі ўнутры каманды, гонар якіх ён абараняў, — адзначыла Бэтан, удава Руслана Салея. — Ім ён аддаваў усе сілы і ганарыўся сваёй краінай. Яму падабалася жыць у ЗША, аднак яго сэрца заўжды будзе тут — у Мінску, у Беларусі.

Для гульцоў сённяшняга «Дынама» Салей — гэта не толькі добры хакеіст, але і добры таварыш па зборнай, у якой Руслан быў капітанам.

— Калі даведаўся, што будзе праводзіцца падобны турнір, было прыемна, што памятаюць нашу легенду, — кажа карэспандэнту «Звязды» Дзмітрый Мялешка, нападаючы мінскага «Дынама». — Руслан Салей заўжды будзе ў нашых сэрцах. Эмоцыі, безумоўна, вялікія. Падчас узнагароджання літаральна слёзы наварочваліся, калі выйшла сям'я, а на экране паказвалі фотаздымкі Руслана.

Дзмітрый распавядае, як трапіў у нацыянальную зборную яшчэ ў зусім маладым узросце, калі глядзеў на Салея, на сапраўднага лідара. Дарэчы, хакеісты «Віцязя» таксама добра памятаюць Салея ў дзеянні. Напрыклад Аляксандр Каралюк, якога прызналі лепшым нападаючым турніру, прызнаўся, што яму вельмі пашчасціла гульня Руслана, называе яго, перш-наперш, даволі граматным хакеістам і ўзгадвае, як калісьці гуляў супраць яго ў НХЛ: ён — за «Сан-Хасэ Шаркс», а Руслан — за «Анахайм».

— Я моцна перажываў авіякатастрофу, — кажа Кары Хейкіля, галоўны трэнер «Дынама» і зборнай Беларусі. — Я працаваў у Яраслаўлі 4 гады. Там мае сябры... Загінуў Руслан, і зборная згубіла лідара. Нам яго не хапае. І ўсе ведаюць, якім ён быў чалавекам.

Не хапае. Сапраўды — не хапае...

Тарас ШЧЫРЫ. Фота Надзеі БУЖАН

ФОТА СЛОВА Яўгена ПЯСЕЦКАГА

У вышынях зоркі — як у полі росы.
Неруш — ад зямлі да Божай высі.
Ад Святога поля да Святых нябёсаў
Блізка, хоць рукою дакраніся.

На травінках росы як чыесьці слёзы.
Ці не нашы продкі тут паснулі.
Ад Святога поля да Святых нябёсаў
Толькі крок ступіць насустрач кулі.

Ля старых акопаў карагоды кветак,
Бліндажы, зарослыя травою...
Я на росных сцежках чую,
як дагэтуль
Пахне поле дымам і бядою.

Святое поле ў Баранавіцкім раёне — унікальнае месца на гістарычнай карце Беларусі. Тут, укруг пясчанага пагорка, дзе падняліся невялічкая капліца і сяміметровы дубовы крыж, былі перапахаваны астанкі воінаў Паўночнай, Першай сусветнай, Вялікай Айчыннай войнаў і землякоў з васьмі навакольных вёсак. Вялікае поле з яго вышынямі ў ваеннае ліхалецце заўжды заставалася стратэгічна важным месцам, таму на гэтай зямлі ў розныя часы палягло столькі ахвяр. У 1983 годзе на Святым полі быў знойдзены новапраслаўлены сінодам Беларускай праваслаўнай царквы цудатворны Загор'е-Сталовіцкі абраз Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Гэтае поле — першы пункт маршруту XIX Міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да Святыняў», якая праз некалькі дзён рушыць у шлях ад сцен Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.

■ Навіны

ПАРКОЎКІ Ў ЦЭНТРЫ МІНСКА АБСТАЛЮЮЦЬ ПАРКАМАТАМІ

Аб гэтым паведаміў генеральны дырэктар УП «Гаражы, аўтастаянкі, паркоўкі» Аляксандр Канаш на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Аўтаматызаваная сістэма аплаты ўжо ўкаранёна на дзвюх паркоўках горада — у раёне плошчы Свабоды і вул. Гікалы, у праекце Прымала ўдзел літоўская кампанія «МодусПарк». Аўтамабіліст, прыязджаючы на стаянку, атрымлівае чэк, які аплачвае пры выездзе з дапамогай паркамата. Кошт паслугі — Br2 тыс. у гадз. на вул. Гікалы, Br4 тыс. — на плошчы Свабоды.

Падабрана яшчэ чатыры пляцоўкі, дзе з'явяцца паркаматы, — раён вуліц Інтэрнацыянальная, Дружная, Маскоўская і Карла Маркса. На іх распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя, вызначаюцца крыніцы фінансавання (сродкі бюджэту або інвестара).

Аляксандр Канаш таксама праінфармаваў, што ў бягучым годзе ў Мінску будзе пабудавана 20 ахоўных стаянак, у тым ліку 10 за бюджэтныя сродкі, 10 — з прыцягненнем сродкаў грамадзян. Шэсць аб'ектаў ужо здадзены, яшчэ тры будуць уведзены ў верасні, астатнія — да канца года.

Узвядзенне часовых ахоўных аўтастаянак пачалося ў сталіцы ў 2008 годзе. Ёмістасць стаянак складае ад 100 да 150 машына-месцаў.

На балансе ахоўна-эксплуатацыйнага ўнітарнага прадпрыемства Мінгарвыканкама «Гаражы, аўтастаянкі, паркоўкі» знаходзіцца 98 аўтастаянак (у тым ліку пяць з правам установкі металічных гаражоў) агульнай колькасцю амаль 26,3 тыс. машына-месцаў і адзін паркінг на 499 машына-месцаў.

Аўтобус загарэўся каля Соснаў

Маецца на ўвазе пасёлак Сосны паблізу сталіцы, побач з якім на аўтамагістралі Мінск — Магілёў і адбылося здарэнне.

— Аўтобус належаў КУП «Мінсктранс». Загаранне ў маторным адсеку было ліквідавана пры дапамозе аўтаматычнай аэразольнай сістэмы пажаратушэння, а таксама двух вогнетушыцеляў, якія выкарыстаў кіроўца, — паведамілі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС. — На момант пажару ў салоне знаходзілася 60 пасажыраў. Пры самастойнай эвакуацыі рэзаную рану рукі атрымаў адзін з іх, грамадзянін 1993 года нараджэння. Ад шпіталізацыі ён адмовіўся. Аўтобус быў адбуксіраваны ў дэпо.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЖОЎТЫ — КОЛЕР ШЧАСЦЯ!

Сапраўднае свята прыгажосці прайшло ў сталічным парку Горкага ў гэтыя выхадныя: больш за сорак будучых мам прынялі ўдзел у «ПуЗ-парадзе 2012».

— У святе прымаюць удзел як тыя жанчыны, што падалі заяўкі загадзя (а гэта якраз каля сарака мам з абсалютна рознымі тэрмінамі цяжарнасці), так і тыя будучыя матулі, якія прыйшлі ў гэты дзень на наш парад. Таму ўдзельніц у сёлетнім святе значна больш! — адзначае адна з арганізатараў, Дар'я Глямбоцкая.

Афіцыйным колерам «ПуЗ -Парада 2012» ужо традыцыйна стаў жоўты, таму будучыя мамы (і нават будучыя таты) абавязкова выкарыстоўвалі колер радасці і сонца ў сваім адзенні і аксесуарах.

У рамках свята арганізаваны фотасесія, майстар-клас па слінганашэнні, конкурсы для ўсёй сям'і. Самым яркім і запамінальным стаў модны паказ малюнкаў на жыватах будучых мам.

«ПуЗ-парад» — некамерцыйны праект сацыяльнага характару, які праводзіцца другі раз парталам Prazdnik. by пры падтрымцы Мінгарвыканкама і закліканы прыцягнуць увагу да паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, абароны мацярынства і дзяцінства.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

■ Хутка ў школу

ЭКСПЕРЫМЕНТ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ЭЛЕКТРОННЫ ДЗЁННІК ДЛЯ РЭАЛЬНАГА ВУЧНЯ

Наваполацкі досвед, дзе ў мясцовай гімназіі ў якасці эксперыменту займаюцца па электронных падручніках, будзе ўкараняцца і ў іншых школах Віцебшчыны.

— У адміністрацыі беларускага Парку высокіх тэхналогій гатовы дапамагчы ў распаўсюджванні эксперыменту. Парк узяўся курыраваць яго правядзенне. Будуць унесены прапановы ў Міністэрства адукацыі наконт школ Віцебшчыны, якія таксама пяройдуць у якасці эксперыменту на электронныя падручнікі, — расказалі ва ўпраўленні адукацыі Віцебскага аблвыканкама. — Эксперымент ужо завершаны на першым этапе. Падведзены вынікі — даволі аптымістычныя. Даказана, што ніякага шкоднага ўплыву на самаадчуванне дзяцей электронныя падручнікі не аказваюць.

Зараз эксперымент на другім этапе. Сёлета асаблівая ўвага будзе надавацца падрыхтоўцы педагогаў пачатковай школы, якія маглі б удзельнічаць у напрацоўцы вопыту. Бо як паказаў першы этап, далёка не ўсе выкладчыкі гатовы да пераходу на сучасныя падручнікі. Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава будзе рыхтаваць студэнтаў 4—5-х курсаў да выкладання. І ўжо да наступнага навучальнага года будуць падрыхтаваны выкладчыкі.

У Оршы эксперыментуюць яшчэ больш прагрэсіўна.

Ужо ўкаранілі электронны дзённік, пры гарадскім аддзеле адукацыі створаны рэсурсны цэнтр. Той жа парк высокіх тэхналогій дапамог: выдзеліў тэхніку, 28 выкладчыкаў там прайшлі вучобу. Так званыя мультыплікатары пераходзяць на стасункі з бацькамі дзяцей праз электронныя сродкі сувязі. У выніку рэальнасцю становіцца электроннае паведамленне бацькам аб поспехах або няўдачах у вучобе іх дзяцей, як і факт прагулу заняткаў. Без новаўвядзенняў і новых падыходаў школа ў век высокіх тэхналогій існаваць не можа.

У сувязі з тым, што сёлета вучні школ будуць здаваць выпускны экзамен па замежнай мове, на Віцебшчыне плануюць умацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу: набудуць неабходную тэхніку для заняткаў, заменяць, калі трэба, старыя камп'ютары на новыя.

На працягу двух гадоў да 1 верасня 2014 года «Белтэлекам» поўнасцю плануе забяспечыць інтэрнэтам усе школы Прыдзвінскага краю. Сёння 97 працэнтаў устаноў адукацыі падключаны да «сусветнага павуціння», 69 працэнтаў — да шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Дэмаграфія

Колькасць насельніцтва Беларусі — 9 млн 457,1 тыс. чалавек

Паводле аператыўных даных, колькасць насельніцтва Беларусі на 1 жніўня гэтага года склала 9 млн 457,1 тыс. чалавек. Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандраценка.

У параўнанні з 1 студзеня 2012 года жыхароў краіны стала менш на 8,1 тыс. чалавек.

Колькасць жыхароў за сем месяцаў гэтага года павялічылася толькі ў Мінску — з 1 млн 885,1 тыс. чалавек на 1 студзеня 2012 года да 1 млн 888,2 тыс. на 1 жніўня бягучага года. У астатніх рэгіёнах рэспублікі колькасць жыхароў за студзень-ліпень зменшылася. У выніку на 1 жніўня бягучага года ў Гомельскай вобласці налічвалася 1 млн 428,4 тыс. чалавек, у Мінскай — 1 млн 402,5 тыс., у Брэсцкай — 1 млн 390,8 тыс., у Віцебскай — 1 млн 210 тыс., у Магілёўскай — 1 млн 77,5 тыс., у Гродзенскай — 1 млн 59,7 тыс. чалавек.

Паводле аператыўных даных, у Беларусі ў студзені-ліпені бягучага года нарадзілася 64 тыс. 355 дзяцей — на 3 тыс. 916 малышоў больш у параўнанні са студзенем-ліпенем 2011 года. Агульны каэфіцыент нараджальнасці за студзень-ліпень у цэлым па рэспубліцы склаў 11,7 на 1000 жыхароў (у студзені-ліпені 2011-га — 10,9 праміле). Сярод рэгіёнаў краіны самы высокі гэты паказчык быў у Брэсцкай вобласці (12,5 праміле), а самы нізкі — у Віцебскай вобласці (10,3 праміле).

Натуральнае змяншэнне насельніцтва склала 10 тыс. 174 чалавекі. Агульны каэфіцыент смяротнасці ў студзені-ліпені бягучага года склаў 13,5 на 1000 насельніцтва (у студзені-ліпені мінулага года ён быў 14,6 праміле). Сярод рэгіёнаў краіны самы высокі гэты паказчык зафіксаваны ў Віцебскай вобласці (15,7 праміле), самы нізкі — у Мінску (9,4 праміле).

У Беларусі захоўваецца дадатны міграцыйны прырост — гэты паказчык склаў за студзень-ліпень бягучага года 2 тыс. 173 чалавекі (у студзені-ліпені ў Беларусь прыбылі 7 тыс. 524 чалавекі, выбылі 5 тыс. 351).

■ Факт

НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ПЕРАХОДЫ ДЛЯ... МУРАШАК

Незвычайныя збудаванні з'явіліся на адным з астравоў Лепельскага возера — там арганізавалі пераходы для мурашак.

Пераходы з'явіліся на экалагічнай сцежцы, размешчанай побач з пансіянатам, дзе круглы год адпачываюць турысты з Беларусі і Расіі. У месцах міграцыі мурашыных калоній усталявалі тры драўляныя масткі, вольнай прасторы пад якімі цалкам дастаткова для перамяшчэння насякомых.

Праўда, і мурашкі, і людзі пакуль рухаюцца як і раней. Так, турысты працягваюць таптаць глебу, абыходзячы бокам драўляны насціл незразумелага ім прызначэння (бо побач няма ні канавы, ні балота), тады як мурашкі арганізавалі сабе пераход прама перад мастком. Распрацоўшчыкі сцяжынкі не бядуюць: увесну, калі мурашкі мігруюць калоніямі, падобныя збудаванні цалкам апраўдваюць затрачаныя на іх установку намаганні.

Дарэчы, гэта не адзіны праект падобнага кшталту ў Беларусі. Так, у 2009 годзе ў Белавежскай пушчы збудавалі падземныя пераходы для жаб. Для гэтага пад аўтамабільнай дарогай, якую часта перасякаюць земнаводныя, праклалі тры трубы. Трыма гадамі раней аналагічны тунэль збудавалі ў Бярэзінскім біясферным запаведніку. Да з'яўлення падземнага пераходу пад коламі аўтамашын кожны тыдзень гінулі да 1,5 тыс. жаб.

У многіх краінах для захавання біяразнастайнасці жывёльнага свету ствараюцца цэлыя комплексы падземных пераходаў і спецыяльных маставых збудаванняў для розных груп жывёл: земнаводных, капытных, дробных млекакормячых. Пры гэтым на асобных участках, дзе міграцыйны шмат, такія пераходы могуць быць размешчаны на адлегласці ад 1 км да 15 км адзін ад аднаго. Пераходы для земнаводных і насякомых ствараюць і на пешаходных экалагічных сцяжынках, каб захаваць унікальную экасістэму той ці іншай мясцовасці.

Андрэй АСФУРА, БЕЛТА

Даты | Падзеі | Людзі

1805 год — створаны Магілёўскі мушкецёрскі полк. Спачатку месцам дыслакацыі палка быў Навагрудак. Першае баявое хрышчэнне стралкі атрымалі на тэрыторыі Польшчы падчас руска-пруска-французскай вайны. У руска-шведскую вайну 1808-1809 г. г. полк ваяваў у Фінляндыі, дзе на яго долю выпалі цяжкія выпрабаванні. У зімовых баях мушкецёры былі кінуты супраць войскаў праціўніка, якія перавышалі іх колькасна ў 8 разоў. Страты былі велізарныя. У палон тады трапіў паранены камандзір атрада, генерал М. Булатаў. У сакавіку 1809 года па тонкім лёдзе Батнічнага заліва, які раставаў літаральна на вачах, яны зайшлі ў тыл шведам і, нечакана атакаваўшы, прымусілі праціўніка скласці зброю. У 1811 годзе полк атрымаў назву Магілёўскі пяхотны. Пад гэтым «іменем» ён уступіў у вайну 1812 года ў складзе 5-й пяхотнай дывізіі расійскай арміі, якой камандаваў Барклай дэ Толі. Яго байцы ўдзельнічалі ў баях пад Полацкам, каля Чашнікаў, на Бярэзіне, дзе напалеонаўская армія была канчаткова разбіта. Адной з самых слаўных старонак гісторыі палка стаў удзел у Крымскай вайне 1853-1856 г. г. Яго воіны змагаліся ў раёне крэпасці Ізмаіл, удзельнічалі ў бітве на рацэ Чорная, а таксама ў легендарнай абароне Севастопаля. Апошняй буйной перамогай для нашчадкаў мушкецёраў стала Першая сусветная вайна. Яны ваявалі на лініі Крэва-Любча, удзельнічалі ў знакамітым Брусілаўскім прарыве.

1953 год — Мікіта Хрушчоў быў абраны першым сакратаром ЦК КПСС. Сын селяніна-бедняка здолеў прайсці шлях ад слесара і шахцёра да кіраўніка савецкай дзяржавы. Ён стаў камуністам праз некалькі месяцаў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, і няўхільна «рос па партыйнай лініі». Сёння рэдка ўспамінаюць, што менавіта Хрушчоў кіраваў «чысткамі» 1938 года ва Украіне, таму што яго прынята лічыць арганізатарам барацьбы з «культам асобы Сталіна». Дэмакратычныя пераўтварэнні ў СССР у пачатку 1960-х гадоў атрымалі ў народзе назву «хрушчоўскай адлігі». Ужо толькі за спыненне рэпрэсій яму гатовы былі дараваць правалы ў эканоміцы і памылкі на знешнепалітычнай арэне. У кастрычніку 1964 года Хрушчоў быў вызвалены з займаных пасад і адпраўлены на пенсію. «Галоўнае я ўжо зрабіў... Хіба каму-небудзь магло прысніцца, што мы можам сказаць Сталіну аб тым, што ён нас не задавальняе, і прапанаваць яму сысці ў адстаўку?» — сказаў ён у апошняй публічнай прамове на пленуме ЦК, які адправіў яго ў адстаўку.

1937 год — нарадзіўся (в. Васілішкі Шчучынскага раёна) Багдзевіч Іосіф Міхайлавіч, беларускі вучоны ў галіне аграхіміі і радыеэкалогіі, акадэмік НАН Беларусі (2003), акадэмік Акадэміі аграрных навук Беларусі (1994), замежны член Украінскай акадэміі аграрных навук (2002), заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (1997). Аўтар больш як 400 навуковых прац, у тым ліку 6 манаграфій, 29 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. Навуковыя працы ў галіне аграхіміі і радыеэкалогіі. Пад яго кіраўніцтвам ажыццёўлены комплекс мерапрыемстваў па павышэнні ўрадлівасці глеб і эфектыўнасці ўгнаенняў у Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002).

Было сказана

Валянцін Таўлай (1914—1947), паэт, публіцыст, літаратуразнаўца:

«Шчасця большага няма ў зярняці, як на ніве роднай прарастаці».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

На гарызанталі: Рукзак. Звонак. Вопс. Вандаль. Кааак. Ік. Татэм. Клас. Крынічка. «Оза». Нерон. Твар. Мох. Раз. Тэрста. Афрыка. Тон. Бік. Маярк. Тонер. Вал. Такса. Фанфара. «Ямаха». Акот. Лада. Суомі. Антрацыт.

На вертыкалі: Бутэлька. Настаўніца. Крысо. Хробат. Зніч. Акіра. Заневга. Адат. Актан. Самагл. Кавун. Ака. Дутар. Ода. Зорка. Фантан. Лімон. Маа. Юрта. Скат. Выстава. Аха. Токар. Глобус. Раал. Лазарэт.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	6.11	20.09	13.58
Віцебск	5.58	20.01	14.03
Магілёў	6.01	19.59	13.58
Гомель	6.01	19.53	13.52
Гродна	6.27	20.23	13.56
Брэст	6.30	20.21	13.51

Месяц

Поўня 31 жніўня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *ПРАЧЫСТАЯ (Успенне Багародзіцы).*
К. *Патрыцыі, Аляксея, Аляксандра, Аўгусціна.*

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Твая жонка шмат балбоча?

— Калі мы былі ў адпачынку, у яе нават язык загарэў!

Увесь дзень шукаў дома сасіскі, але так і не знайшоў. Потым паглядзеў на задаволены твар цесця і зразумеў: сасіскі ў цесце...

— Алё! Прывітанне, Воўчык.

— Э-э, наогул, я Лена.

— Ну не ведаю: у майго мужа ў тэлефоне ты Воўчык.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 27.631. Індэкс 63850. Зак. № 3832.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 жніўня 2012 года.